ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ ... ОКРУЖНО...
Алма-Ата, Ленина 81 гос. публ.б-ке фев.-янв.-32г. СБ-II

„...НАША КРАІНА-УДАРНАЯ БРЫГАДА ПРАЛЕТАРЫЯТУ УСІХ КРАЁУ..."
(СТАЛІН)

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעט[illegible]ײניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ Менск, Пляц Волі № 17, 1-шы паверх
ТЭЛ. Сакратара—№ 478, Рэдактара—№ 769, Канторы—№ 244, Сэктара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 43 (3132) СУБОТА 21 ЛЮТАГА 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.
Падпісная плата:
На 1 месяц — 90 к.
„ 3 „ — 2 р. 70 к.
„ 6 „ — 4 р. — к.
„ 1 год — 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

УЧОРА АДЧЫНІУСЯ Х УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САВЕТАУ

Няўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію камуністычнай партыі і яе ленінскую нацпалітыку, наносячы руйнуючыя ўдары клясаваму ворагу і яго агэнтуры правым і „левым" апартуністам, нацапартуністам, двурушнікам і прымірэнцам да ўхілаў, пралетарыят і працоўныя БССР штурмуюць вышыні прамфінпляну трэцяга рашаючага году, пераможна ідуць па шляху суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як клясы, па-бальшавіцку змагаюцца за пяцігодку ў чатыры гады

Х ЗЬЕЗД: ДЭМАНСТРАЦЫЯ НАШЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ МАБІЛІЗАЦЫЯ ПРАЦОЎНЫХ МАС БССР ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

Уступнае слова т. Чарвякова

Пэрыяд ад IX да X Усебеларускага Зьезду саветаў зьяўляўся пераломным для Савецкага Саюзу, а ў тым ліку і для савецкай Беларусі, як неразрыўнай яго часткі, а таксама і для капіталістычнага сьвету.

Для савецкіх рэспублік гэты пералом адзначыўся уступленьнем у пэрыяд сацыялізму з гігантскім разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва. У капіталістычных краінах гэты пералом адзначыўся ўсё паглыбляючымся рэзкім эканамічным крызысам.

Выконваючы пастановы IX Усебеларускага Зьезду Саветаў на аснове генэральнай лініі партыі, рабочая кляса БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б, вядучы ўсіх працоўных па шляху пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, дабілася надзвычайна вялізарных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, дамаглася выкананьня і перавыкананьня праграмы першых двух гадоў пяцігодкі, рашучага павароту да сацыялізму мільённых серадняцкіх мас, стварыўшы магчымасьць перайсьці ад лёзунгу абмежаваньня і выцясьненьня кулацтва да лёзунгу ліквідацыі яго, як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, яшчэ большага інтэрнацыянальнага аб'яднаньня працоўных усіх нацыянальнасьцяй у БССР, а таксама аб'яднаньня працоўных БССР з працоўнымі саюзных рэспублік для барацьбы за сацыялізм.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Савецкі Ўрад БССР пры сталай дапамозе з боку Саюзнага Ўраду забясьпечыў магутны размах сацыялістычнай індустрыялізацыі, які сапраўджваўся агромністым пад'ёмам вытворчага энтузіязму рабочых мас, стварыў моцную базу для выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

Посьпехі Савецкай Беларусі ў галіне разгортваньня сацыялістычнай прамысловасьці характарызуюцца тым, што на працягу апошняга году валавая прадукцыя БССР перавысіла даваенны ўзровень больш чым у тры разы і больш чым у два разы ўзровень 1927-28 году.

Вялізарныя посьпехі індустрыялізацыі стварылі моцную базу для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Колькасьць саўгасаў, іх зямельная плошча і ўдзельная вага ў валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі за апошнія гады значна падвысілася. Калгасная пяцігодка перавыканана ўжо ў бягучым гаспадарчым годзе. Наперакор панічным заявам правых апартуністых аб дэградацыі сельскай гаспадаркі, рабочая кляса пад кіраўніцтвам Кампартыі на базе кіруючай ролі сацыялістычнай прамысловасьці, аб'ядноўваючы распыленыя адзінаасобныя сялянскія бедняцка - серадняцкія гаспадаркі ў калгасы, забясьпечыла магчымасьць пасьпяховага вырашэньня асноўных сельска - гаспадарчых праблем. Зернавая праблема ў Савецкім Саюзе з посьпехам вырашана. У сучасны момант краіна саветаў разгортвае вялізарную работу для вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы, што ўскладае на Савецкую Беларусь асабліва адказныя задачы.

Побач з вырашэньнем важнейшых гаспадарчых задач у галіне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі пралетарыят, калгаснікі і бедняцка-серадняцкія масы Савецкай Беларусі напружвалі ўсе свае сілы для ўздыму культурнага ўзроўню гораду і вёскі, для вырашэньня задач будаўніцтва культуры пралетарскай па зьместу і нацыянальнай па форме.

Увядзеньне ўсеагульнага навучаньня арганізацыя работы па завяршэньню ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослых ў 1931-32 годзе, вялікая работа ў галіне прафтэхнічнага навучаньня, шырокае разгортваньне вышэйшых навучальных устаноў, запаўняемых студэнтамі з рабочых, батракоў, калгасьнікаў і бедняцка - серадняцкіх мас сялянства для падрыхтоўкі новых пралетарскіх кадраў па ўсім галінам народнай гаспадаркі, — вось яскравыя прыклады, якія характарызуюць посьпехі Савецкай Беларусі за апошні час у галіне культурнага будаўніцтва.

Гіганцкія тэмпы індустрыялізацыі краіны значна павялічылі колькасьць рабочых на вытворчасьці, забясьпечылі ўзьняцьце матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочых шляхам павышэньня рэальнай заработнай платы і пераходу на сямігадзінны рабочы дзень, ўвядзеньня пяцідзеннага непарыўнага тыдню і ліквідацыі ў асноўным беспрацоўя. Усе гэтыя посьпехі Савецкай Беларусі дасягнуты таму, што пад кіраўніцтвам кампартыі рабочая кляса, абапіраючыся на калгасьнікаў і бедняцкія масы вёскі ў саюзе з серадняком, рашуча змагалася і змагаецца за ажыцьцяўленьне Ленінскай нацыянальнай палітыкі, накіраванай на зьнішчэньне рэшткаў эканамічнай і культурнай няроўнасьці, на ўзмацненьне інтэрнацыянальнай сувязі ўсіх працоўных, на рашучую барацьбу за перамогу сацыялізму.

КП(б)Б забясьпечыла ўдзел шырокіх рабочых мас ў непасрэдным ажыцьцяўленьні беларусізацыі дзяржаўнага, гаспадарчага, каапэрацыйнага і прафэ-

сыянальнага апаратаў, ў вывучэньні гісторыі эканомікі Беларусі і г. д. Усё гэта садзейнічала ўзмацненьню кіруючай ролі рабочае клясы ў справе утварэньня беларускай культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу.

Важнейшае месца ў вырашэньні Ленінскай нацыянальнай палітыкі займалі і займаюць ў жыцьці савецкай Беларусі пытаньні абслугоўваньня нацменшасьцяй. Каб зьнішчыць нацыянальную замкнутасьць і абмяжаванасьць, каб замацаваць інтэрнацыянальную салідарнасьць працоўных усіх нацыянальнасьцяй для барацьбы за перамогу сацыялізму. Камуністычная партыя і Ўрад Савецкай Беларусі ўвесь час клапаціліся аб палепшаньні матар'яльнага і культурнага становішча нацменшасьцяй, мабілізавалі рабочых батрацка - бедняцкія і серадняцкія масы вёскі для рашучай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на данным этапе, контррэвалюцыйным беларускім нацдэмакратызмам і шавінізмамі іншых колераў.

Пад кіраўніцтвам партыі і Ўраду рабочая кляса і працоўныя Савецкай Беларусі з посьпехам перамагаюць ўсе цяжкасьці, якія сустракаюцца на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, добра ведаючы, што асноўнымі ўмовамі пасьпяховай і хутчэйшай перамогі гэтых цяжкасьцяй зьяўляецца ўзмацненьне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, разгортваньне наступленьня на капіталістычныя элемэнты па ўсяму фронту.

Посьпехі ў справе індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі пашырылі сацыяльную базу апоры партыі і савецкай улады на вёсцы ў асобе калгасьніка.

Ажыцьцяўляецца задача, пастаўленая Ўладзімерам Ільлічом Леніным аб ператварэньні Расеі нэпаўскай у Расею сацыялістычную. Ліквідацыя кулацтва, як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі мае вялічэзнае палітычнае значэньне і азначае «штурм рабочае клясы на апошні аплот капіталістычнай эксплёатацыі краіны».

Гэтыя посьпехі рабочае клясы і ўсіх працоўных у справе будаўніцтва сацыялізму былі магчымы дзякуючы агромністай актыўнасьці рабочае клясы і ідучых за ёй працоўных мас, што сапраўджалася шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва, ударніцтва і рашучай перабудовы работы ўсіх органаў пралетарскай дыктатуры ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду пад лёзунгам мабілізацыі мас за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за перамогу цяжкасьцяй, за рашучы паварот усіх пралетарскіх арганізацый да вытворчасьці, да калгаснага будаўніцтва.

Пасьпяховае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі выклікае жорсткае супраціўленьне з боку аджываючых клясаў. У сілу гэтага,—сацыялістычнае будаўніцтва ў БССР, як і ў СССР адбываецца ва ўмовах надзвычайна абвостранай клясавай барацьбы. Гэтая барацьба паглыбляецца яшчэ і тым, што ў БССР, як у прымежнай Рэспубліцы ў больш рэзкай форме наглядаецца ўзаемадачыненьне контррэвалюцыйных сіл унутры БССР з тымі варожымі сіламі ў буржуазных краінах, якія вядуць падрыхтоўку да вайсковага нападу на Савецкі Саюз.

Капіталістычны сьвет перажывае ў сучасны момант надзвычайна глыбокі эканамічны крызыс. Гэты крызыс разбівае тэорыю правых апартуністаў, аб «арганізаваным капіталізьме». Гэты крызыс, перарастаючы ў палітычны, узьнімае новую хвалю рэвалюцыйнага руху ў капіталістычных краінах. Разам з абвастрэньнем усіх супярэчнасьцяй у імпэрыялістычнай сыстэме ўсё больш абвастраюцца супярэчнасьці паміж Савецкім Саюзам і капіталістычны сьветам. Нянавісьць сусьветнай буржуазеі да першай у сьвеце дзяржавы — дыктатуры пралетарыяту — бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту, адбіваецца ў шалёнай хлусьлівай кампаніі буржуазіі, аб прымусовай працы ў СССР, аб «дэмпінгу» і накіравана на арганізацыю эканамічнай блёкады, на падрыхтоўку вайны супроць Савецкага Саюзу.

Спробы міжнароднай буржуазіі справапыраваць Савецкі Саюз на вайну праз Усходня - Кітайскую авантуру сустрэлі руйнуючы адпор.

Наша слаўная Чырвоная армія прадэманстравала ўсяму сьвету, што яна захавала сваю баявую моц і цьвёрда стаіць на варце савецкіх межаў.

У барацьбе супроць Савецкага Саюзу імпэрыялістыя імкнуцца абаперціся на контррэвалюцыйныя элементы ўнутры нашае краіны. Гэтая сувязь контр-рэвалюцыйных кулацка - нэпманаўскіх і шкодніцкіх элемэнтаў унутры Савецкай Беларусі і інтэрвэнцыяніцкімі групамі буржуазных дзяржаў найбольш яскрава выяўлена пры раскрыцьці дзейнасьці контр - рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал дэмакратаў.

Беларускія нацыянал - дэмакраты ў гады Кастрычнікавай рэвалюцыі, як агенты буржуазіі, абшарнікаў і кулакоў, праводзілі адкрытую барацьбу з паўстаўшым пралетарыятам Савецкай Беларусі, яны імкнуліся ў саюзе з польскім фашызмам да буржуазнай беларускай народнай рэспублікі. Пераможнае разгортваньне Кастрычнікавай Рэвалюцыі прывяло да разгрому контр-рэвалюцыйнай арганізацыі беларускіх нацыянал-дэмакратаў, зьліквідаваўшы іх дзейнасьць на тэрыторыі БССР.

Клясавая сутнасьць контр - рэвалюцыйнай беларускай нацыянал-дэмакратычнай групы, якая ставіла стаўку на кулака, нэпмана, выступаючы з лёзунгам «адраджэньня» буржуазнай Беларусі, заключаецца ў барацьбе за аднаўленьне капіталізму ў нашай краіне, за ператварэньне Беларусі савецкай у Белерусь буржуазна - капіталістычную фашысцкую.

Выкрыцьцё гэтай контр-рэвалюцыйнай групы і яе дзейнасьці выклікалі надзвычайнае абурэньне шырачэзных мас рабочых, батрацтва, беднаты, калгасьнікаў і ўсіх працоўных, якія яшчэ больш згрупаваліся навакол Кампартыі для барацьбы за абарону сваёй пралетарскай бацькаўшчыны, для выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Накіроўваючы галоўны агонь супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі вядзе бязьлітасную барацьбу з рэшткамі беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шовінізмамі іншых колераў.

У змаганьні за няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, КП(б)Б і пад яе кіраўніцтвам рабочая кляса, разьбіўшы ў свой час контр-рэвалюцыйны троцкізм,—вядуць бязьлітасную барацьбу супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе—правага апартунізму—гэтай кулацкай агентуры ў радох партыі, супроць «левых» апартуністых, супроць права-«левацкага» блёку, і прымірэнцтва да ўхілаў.

Праявы правага ўхілу ў КП(б)Б цесна перапляталіся з ухіламі ў бок нацыянал-апартунізму. Нацыянал-апартунізм зьяўляецца агентурай нацыянал-дэмакратаў у радох камуністычнай партыі. КП(б)Б мабілізавала ўсю партыйную арганізацыю, рабочую клясу і ўсіх працоўных на рашучую барацьбу супраць праяваў нацыянал-апартунізму, выходзячы з таго, што погляды нацыянал-апартунізму не сумяшчальны з прабываньнем у шэрагах камуністычнай партыі.

У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць клясавых ворагаў, у адказ на імкненьні міжнароднай буржуазіі арганізаваць інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу і сарваць выкананьне нашай пяцігодкі, рабочая кляса і ўсе працоўныя Савецкай Беларусі павінны яшчэ больш згуртавацца вакол Кампартыі і яе Ленінскага ЦК для рашучага сацыялістычнага наступу па ўсяму фронту, для бязьлітаснага выкарчоўваньня рэшткаў капіталізму для узмацненьня абароназдольнасьці краіны Саветаў, для ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Х Усебеларускі Зьезд Саветаў, абгаварыўшы ўсе пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва, сваімі пастановамі павінен яшчэ больш мабілізаваць рабочыя і працоўныя масы пад кіраўніцтвам партыі для таго, каб саветы Беларусі былі сапраўднымі барацьбітамі за генэральную лінію партыі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў Савецкай краіне, за узмацненьне абароназдольнасьці краіны і баяздольнасьці Чырвонай арміі, за баявыя бальшавіцкія тэмпы ў рабоце.

Няхай жыве Савецкі Саюз!

Няхай жыве Камуністычная партыя і яе Ленінскі ЦК.

Няхай жыве Х Усебеларускі Зьезд саветаў!

Будуюць мясную фабрыку (саўгас «Маяк Камуны» Быхаўшчына).

Выбары кіруючых органаў Х Усебеларускага Зьезду Саветаў

Учора а 7-й гадзіне ўвечары пры перапоўненым дэлегатамі і гасьцямі рабочымі зале Дому Культуры адкрыўся Х Усебеларускі Зьезд Саветаў.

Пасьля ўступнай прамовы т. Чарвякова зьезд аднадушна абраў кіруючыя органы зьезду.

Прэзыдыум зьезду

Аранштам, Антонаў, Антошкіна, Бэнэк, Будзінскі, Балцін, Валодзька, Вэндэ, Варонiч, Вэрамейчык, Вальфсон, Гей, Галадзед, Гантман, Грысевіч, Горын, Гурэвіч, Гравіт, Дубіцкая, Калнін, Кавальчук, Каралёў, Калістава, Кулікава, Іваноў, Ляўкоў, Лаціс, Івашкевіч, Міцькоў, Невяроўскі, Несьцяровіч, Мясьнікова, Марчанка, Платун, Паляноў, Парахонька, Паўлючонак, Папугай, Рапапорт, Рыжоў, Рачыцкі, Рабцава, Радзыкоў, Розэнберг, Сапрыцкі, Скробук, Хлеўнікаў, Хацкевіч, Хаськін, Цімашэнка, Чарвякоў, Чарнушэвіч, Чычэраў, Шаранговіч, Шапіра, Шылак, Ягораў, Яцкевіч Ульяна, Юхневіч Яніна, Замберг, Лубкоў.

Ганаровы прэзыдыум

Сталін, Молатаў, Калінін, Кагановіч, Варашылаў, Куйбышаў, Кіраў, Касіор, Андрэяў, Арджанікідзе, Рудзутак.

Сакратарыят зьезду

Аўчыньнікаў, Амбражунас, Бэрзін, Апылінскі Осіп—адзінаасобнік Шклоўскага раёну, Гольдберг, Гніляковіч, Дубіна, Дамброўскі, Жуковіч, Жыгіна Марыя — работніца скурзаводу імя Сталіна, Магілеў, Каменштэйн, Козінец,—старшыня Мозырскага РВК, Ластоўскі, Марусэвіч, Мікуловіч—рабочы ўдарнік, гор. Орша, Пракофьева—работніца фабрыкі, Полацк, Шастакоў Юрчанка Януб, былы партызан калгасьнік Чэчэвіцкага р., Русава Марыя—калгасьніца Сеньненскага раёну, Цесьлянок Дар'я—старшыня с-савету Камарынокага раёну.

Мандатная камісія

Баброўніцкая, Вансоўскі, Васілевіч, Васарман, Гурыновіч, Гуткін, Гродзес, Дубаўцоў, Жалезны (старшыня Магілеўскага РВК) Кавалёў, Кац, Левіт, Лісоўская (калгасьніца Ушацкага раёну), Манжалей, Майзіт, Плятнёў, Сьпектар, Сьцепанаў (старшыня Бабруйскага РВК), Цэнцыпер, Эпштэйн, Варонічаў.

ЦВК СССР вітае Усебеларускі Зьезд Саветаў

Менск, зьезду саветаў БССР

Прэзыдыум ЦВК СССР вітае Х Ўсебеларускі зьезд саветаў, заклікаючы вырашыць гістарычную задачу па забясьпечаньні выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады на тэрыторыі БССР і пераможнага завяршэньня яе трэцяга рашаючага году.

Упяршыню ўдзельнікамі зьезду БССР зьяўляюцца ўдарнікі сацыялістычнага будаўніцтва рабочыя і калгасьнікі, якія маюць вопыт упартай рэвалюцыйнай работы па калектывізацыі сельскае гаспадаркі і правядзеньні не абходнымі тэмпамі сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі, што служыць парукай пасьпяховай работы зьезду.

Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што працоўныя масы БССР усіх нацыянальнасьцяй, якія здолелі за першыя два гады пяцігодкі перамагчы ўсе труднасьці выкрыць і выдаліць з савецкіх органаў апартуністаў і контр-рэвалюцыйных шавіністаў, стройнымі радамі пойдуць супольна з усім Саюзам ССР у далейшае разгортанае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце.

Старшыня ЦВК Саюзу ССР КАЛІНІН. Сакратар ЦВК Саюзу ССР ЕНУКІДЗЕ.

Дэлегаты зьезду калгасьнік т. Юрчэня і работніца фабрыкі штучнага валакна (Магілеў)—за гутаркай.

Адкрыўся дзесяты Ўсебеларускі ўдарны

◆ Над дамамі сталіцы БССР выкінуліся чырвоныя сьцягі. Сёньня адкрываецца Х Усебеларускі Зьезд Саветаў.

◆ Пачатак сёмае. У зале Дома Культуры вісіць гуя. На хорах няма

Калгасьнікі нозаарганізаванага калгасу. гутараць з старымі калгасьнікамі калгасу «Чырвоны Араты» (Ельскі раён).

ужо вольнага месца. На сцэне рабяцца апошнія падрыхтаваньні. Ля сьцягаў і бюстаў Леніна, ганаровая варта. Ярка сьвеціцца цыфра «Х».

◆ Заслона адкрылася, шум у зале сьціх. Урачыстая цішыня. Ля стала тт. Чарвякоў і Хацкевіч. Мікрафон глытае словы т.Чарвякова, рупары сьпяшаюцца перадаць на ўсю залю:

— Паводле даных мандатнай камісіі на зьезд прыбыла 610 дэлегатаў з рашаючым голасам і 104 з дарадчымі. На падставе канстытуцыі БССР гэта колькасьць прыбыўшых дэлегатаў зусім дастаткова.

— Абвяшчаю Х Усебеларускі Зьезд Саветаў адкрытым.

◆ Пралілі сьвятло пражэктары. Чокнулі фотаапараты. Ад яркага сьвятла юпітэраў плюшчацца вочы.

— Х Зьезд набывае вялікае палітычнае значэньне.

— Х Усебеларускі Зьезд Саветаў абгаворыць усе пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва, сваімі пастановамі павінен яшчэ больш мабілізаваць працоўныя масы пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, для таго, каб саветы Беларусі былі сапраўднымі праваднікамі генэральнай лініі партыі, штабамі барацьбы за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнае эканомікі ў нашай краіне, за ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны і баяздольнасьці Чырвонай арміі, за баявыя бальшавіцкія тэмпы ў рабоце.

◆ Тав. **Хацкевіч** ад імя камфракцыі зьезду зачытаў прозьвішчы кандыдатаў ў прэзыдыум. Тт. **Гей, Галадзед, Гантман, Чарвякоў, Шаранговіч, Ягораў**... кожныя з гэтых кандыдатур выклікае буру воплескаў.

◆ Прыгатоўце мандаты.

— Хто за?

Падняўся лес рук, на якіх лістамі бліснулі зялёныя мандаты.

◆ Прапануюць абраць ганаровы прэзыдыум.

— Сталін!

У сьценаграме будзе ў дужках адзначана (аплёдысмэнты). Інакш на самой справе. Імя правадыра зьезд спаткаў нарастаючай бурай воплескаў. У гэтых воплесках прыхільнасьць да правадыра, прыхільнасьць да той партыі, якую ўзглаўляе ён—Сталін.

— **Молатаў, Калінін, Кагановіч, Варашылаў...**

Імя **Варашылава** выклікае новую буру авацый.

— **Куйбышаў, Кіраў, Касіор, Андрэеў, Арджанікідзе, Рудзутак.** Заля ня сьціхае ад воплескаў.

◆ Тав. **Чарвякоў** прадстаўляе слова ад ЦК КП(б)Б **т. Гею.** Першы сакратар ЦК падыходзіць да трыбуны. Ён чакае пакуль сьціхнуць воплескі. Толькі пасьля доўгай паўзы ён пачынае.

— Х Усебеларускаму Зьезду Саветаў гарачае бальшавіцкае прывітаньне ад Цэнтральнага камітэту бальшавікоў Беларусі.

Напружана, з вялікай увагай слухае зьезд, глыбокую прамову т. **Гея...** Цішыня прарываецца воплескамі калі тав. **Гей** гаворыць аб вялікіх перамогах сацыялізму, аб бязьлітаснай барацьбе з ворагамі рабочае клясы, агентамі крывавага фашызму беларускімі нацдэмамі. Воплескі вітае зьезд генэральную лінію партыі.

◆ На Зьезд прышлі рабочыя менскіх прадпрыемстваў. Прышлі вітаць: «Комунар», «Энэргія», «Акцябр» «Бальшавік», «Дрэваапрацоўшчык». Прышлі тыя, хто з гонарам скончылі ўдарны квартал і з перамогамі ўступілі ў трэці рашаючы.

◆ У іх рапарце—голас мільёнаў рабочае клясы, якая будуе сацыялізм. У кладцы фундаманту сацыялізму ўдзельнічаюць гэтыя мільёны. Мільёны складаюцца з адзінак. Гэтыя адзінкі—сьлесары, такары, гарбары, шаўцы, шкляры, краўцы.

Кожны мае свой твар, сваю звычку. Кожны змагаецца з труднасьцямі, кожны кладзе сваю цэгліну ў фундамант сацыялізму.

◆ Прышла вітаць Чырвоная армія: Заля апплёдысмэнтамі ахапіла стройныя шэрэнгі дэлегацыі Н-скай кавалерыйскай дывізіі. Усе ўстаюць. Ура. Гучнае ўра аддаецца ў высокіх зводах Культуры.

— Няхай жыве Чырвоная армія!

Горача сустракае зьезд прадстаўнікоў слаўнай Чырвонай арміі.

◆ Тав. **Аніщчук**, громка і выразна рапартуе:

— 75 тысяч—па пазыку «пяцігодка ў 4 гады».

— 12 тысяч—на дырыжабль «Клім Варашылаў».

Зноў імя **Кліма** выклікала буру авацый.

—Мы прынялі прапанову горлаўскіх і днепрапятроўскіх рабочых аб выпуску новай пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі...

◆ Да будынку Культуры, залітаму электрычным сьветам прышла школа чырвоных камандзіраў імя ЦВК БССР.

◆ Лыжная каманда з Быхаўшчыны і Крычаўшчыны прывезьлі з сабой рапарты ад калгасьнікаў.

Дэлегатка зьезду, старшыня Шчэдрынскага сельсавету. Запаўняе анкету.

◆ Рапарты калгасьнікаў, цыфры, якімі запоўнены гэтыя данясеньні, вырастаюць у паказчыкі перамог. Яны кажуць аб тым, што назаўсёды ўходзіць мінулае, што гэтае мінулае зьнікае, што расьце новая сапраўдная савецкая калгасная вёска. Да мінулага звароту няма, шляхі адрэзаны, ёсьць адзін шлях, шлях да будучага, шлях сацыялізму...

◆ Дэлегатаў на зьезьде 774. Але на зьезьдзе прысутнічаюць мільёны. Гэта яны рапартуюць зьезду, гэта яны ператварылі Х зьезд ударным на завяршэньні будаўніцтва фундаманту сацыялізму.

◆ Зьезд слухае прывітаньне прадстаўніка чырвонаштандартага ўдарнага настаўніцтва БССР...—Воля настаўніцтва—генэральная лінія Ленінскай партыі. Няхай жыве т. **Сталін!..**

◆ Х Зьезд салютавалі і з цэхаў заводаў, фабрык, калгасаў, казарм школ і гарадоў. У гэтым салюце—твар клясы, твар таго, каму прысуджана завяваць сьвет.

◆ Сёньня адрываючы лісток календара мы чытаем:

— 20 лютага 1906 г. у Ачакове адбыўся суд над лейтэнантам Шмітам і матросамі рэвалюцыянэрамі.

— 20 лютага 1919 г. быў выдан дэкрэт аб стварэньні савецкіх гаспадарак.

Сёньня да календара 1931 г. можна прыпісаць яшчэ адну падзею, якая ўвойдзе ў гісторыю барацьбы за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

— 20 лютага 1931 г. у Менску адкрыўся Х Усебеларускі Зьезд Саветаў

Б. Брадоцкі.

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ ЛЕНІНСКАЙ НАЦПАЛІТЫКІ

„У ІХ у капіталістаў абвостраньне нацыянальнага пытаньня і рост нацыянальнага вызваленчага руху, які пераходзіць у нацыянальную вайну...“ (СТАЛІН)

„У НАС у СССР, узмацненьне аспоў нацыянальнага брацтва, забясьпечаны нацыянальны мір і згуртаваньне мільённых мас народаў СССР вакол Савецкай улады“ (СТАЛІН)

А. ХАЦКЕВІЧ

АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ ЗА ДВА ГАДЫ У БССР

Два гады, якія прайшлі з часу IX-га Усебеларускага Зьезду Саветаў зьяўляюцца першымі двума гадамі пяцігодкі. За гэты час карэнным чынам перабудован увесь гаспадарчы і культурны твар Савецкае Беларусі.

Наша прамысловасьць ня толькі гіганцкі вырасла колькасна, але яна ўся рэарганізавана на зусім новых падставах. У выніку шпаркага тэмпу разьвіцьця прамысловасьці, яе прадукцыя перавышае даваенную больш чым у тры разы. Значна павялічыўся лік прамысловых рабочых. Разам з тым вырасла і разьвілася кааперованая саматужная прамысловасьць як у горадзе, так і ў мястэчку і на вёсцы. Зьліквідавана ў асноўным беспрацоўе. Побач з ростам пралетарыяту БССР ідзе сыстэматычнае палепшаньне яго дабрабыту.

Адначасова з вялізарнымі посьпехамі ў разьвіцьці прамысловасьці мы маем і значны рост сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі—саўгасаў і калгасаў. Выкрыцьцё і ліквідацыя прышчэпаўшчыны, якая імкнулася перавесьці сельскую гаспадарку БССР на шлях капіталістычнага разьвіцьця і гэтым дапамагчы нацдэмам у іх контрревалюцыйных імкненьнях рэстаўраваць уладу буржуазіі і памешчыкаў. Мабілізацыя рабочай клясы і працоўнага сялянства вакол задач сацыялістычнай гаспадаркі—вось магутны вагар пашырэньня і ўзмацненьня саўгасаў за гэты час і шырокага разгортваньня калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

За апошнія паўтара—два гады зямельная плошча пад саўгасамі павялічана больш чым у тры разы, а процант калектывізаванай зямельнай плошчы дасягае звыш 20-ці. Калі-ж да гэтага дадаць, што рост прамысловасьці БССР перавышае рост прамысловасьці па саюзе ССР (169,1 проц. у БССР супроць 124 проц. па саюзе ССР), дык стане зусім зразумела, што правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня, якое заключаецца ў тым, «каб зьнішчыць тую адсталасьць (гаспадарчую, палітычную і культурную) нацыянальнасьцей, якую яны атрымалі у спадчыну ад мінулага, каб даць адсталым народам магчымасьць дагнаць цэнтральную расію ў дзяржаўных, культурных і гаспадарчых адносінах» (Сталін)—за апошнія гады стала ў нас рэальнай сапраўднасьцю

У Савецкай Беларусі ствараецца грунтоўная гаспадарча-сацыялістычная база для ліквідацыі сьлядоў эканамічнай няроўнасьці, якая засталася нам у спадчыну ад палітыкі царызму і капіталізму

За апошнія два гады мы маем таксама вялізарнейшае дасягненьне ў справе будаўніцтва сацыялістычнай нацыянальнай культуры Савецкая Беларусь зьяўляецца першай з усіх рэспублік Савецкага Саюзу, якая ўвяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне. Мы ахапілі школамі каля 95 проц. дзяцей узросту ад 8 да 11 год і лікпунктамі ахоплена за два гады каля 700.000 дарослага працоўнага насельніцтва. Колькасьць хат-чытален павялічылася больш чым у два разы (307 у 1927-28 г. і 650 у 1929-30 г.).

Вялізарныя посьпехі мы маем таксама ў справе разьвіцьця самай адсталай у мінулым галіны культурнага будаўніцтва—сярэдняй і вышэйшай прафэсыянальнай асьветы: замест 30 тэхнікумаў у 1928-29 г. мы на сёньняшні дзень маем 65, замест 10 школ фабзавуча—20 проц. колькасьць вышэйшых навучальных устаноў, таксама і рабфакаў вырасла ў тры разы: вышэйшых навучальных устаноў было ў 1928-29 г.—4, а зараз у 1930-31 годзе мы маем 12; рабфакаў у 1928-1929 г. было 8, а зараз мы маем 24.

Мы маем нябывалы рост выдавецкай справы. Адным Белдзяржвыдавецтвам выдадзена ў 1929-30 г. 1815 розных назваў кніжак; часопісаў у Савецкай Беларусі маецца 20, газэт цэнтральных—14 і раённых—32.

Нашы дасягненьні ў галіне будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу характарызуюцца ня толькі вышэйадзначанымі колькаснымі паказчыкамі,—значныя посьпехі мы маем таксама па лініі якаснага палепшаньня нашай культурнай справы. Так, напрыклад, значна вырасла рабочая праслойка ва ўсіх нашых навучальных установах, асабліва ў рабфаках. Закладзена значная база па падрыхтоўцы пралетарскіх навуковых кадраў: у сучасны момант рознымі навучальнымі і навуковымі ўстановамі падрыхтоўваюцца 260 асьпірантаў—выхадцаў з рабочых і працоўных сялянскіх мас. Разам з гэтым шырока мабілізавана марксыцка-навуковая грамадзкасьць на змаганьне з уплывамі буржуазных тэорый у розных галінах навукі.

Савецкая Беларусь мае значныя посьпехі ў справе беларусізацыі савецкіх і грамадзкіх устаноў, і асабліва ў справе беларусізацыі ніжэйшых і сярэдніх школ, якія, за выключэньнем школ, абслугоўваючых нацменшасьці, вядуць работу на беларускай мове. У прафтэхнічных сярэдніх і вышэйшых навучальных установах выкладаньне на белмове вядзецца на процантаў 50—60, у пэдтэхнікумах і на пэдфаку БДУ выкладаньне на белмове праводзіцца поўнасьцю. Нізавы савецкі апарат і апарат грамадзкіх арганізацый вядзе работу выключна на белмове.

Разам з гэтым за апошнія часы наглядалася недаацэнка справы беларусізацыі паасобнымі зьвеньнямі савецкіх і грамадзкіх устаноў і арганізацый. З прычыны гэтага Кастрычнікаўскі пленум ЦК КП(б)Б паставіў пытаньне аб беларусізацыі ва ўсю шырыню, арыентуючы партарганізацыю і пралетарскую грамадзкасьць на ліквідацыю раду прарываў у галіне беларусізацыі. У прыватнасьці, па працягу сьнежаня месяца праводзіўся спэцыяльна месячнік праверкі беларусізацыі і работы сярод нацменшасьцяй.

На фоне агульнага росту эканамічнага і культурнага разьвіцьця краіны мы маем значныя посьпехі ў справе уздыму эканамічнага і культурнага дабрабыту нацменшасьцяй, якія насяляюць БССР, у справе ўцягненьня рабочых і працоўных нацменшасьцяй у сацыялістычнае будаўніцтва. У гэтых адносінах трэба з асаблівым задавальненьнем адзначыць нашы посьпехі па лініі аздараўленьня эканамічнага і бытавога жыцьця працоўнага яўрэйскага насельніцтва. Яшчэ зусім нядаўна мы прымушаны былі канстатаваць, што «колькасна яўрэйская беднага, якая складаецца з беспрацоўных саматужнікаў, беспрацоўных рабочых, былых служачых і г. д. зьяўляецца найбольш шматлікім слоям мястэчку»; што «шырокія працоўныя яўрэйскія масы царскай палітыкай загнаны ў эканамічны тупік» і што «на вырашэньне так званага яўрэйскага пытаньня неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу». Зараз мы можам сьмела сказаць, што дзякуючы шпаркаму тэмпу разьвіцьця нашай прамысловасьці і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі з аднаго боку і з другога асобным мерапрыемствам, ужытым Кампартыяй і Савецкім Урадам па эканамічным упарадкаваньні мястэчак, гэты «тупік» у асноўным зьнішчаецца і вострасьць «яўрэйскага» пытаньня паступова адпадае

За апошнія часы значная колькасьць яўрэйскай працоўнай бедняты ўцягнута ў прамысловасьць. Каля 2½ тыс. сямей яўрэйскай бедняты ўпарадкавана па сампрамкаапэрацыі. Колькасьць яўрэйскіх сямей, аб'яднаных у калгасы ў апошнія паўтары гады ўзрасла больш чым у два разы—з 2.145 сямей у сярэдзіне 1929 г. да 4.862 у канцы 1930 г. Большасьць некваліфікаванай часткі яўрэйскай бедняты ўцягнута ў вытворчую работу па лініі шляхбудаўніцтва, лесараспрацовак.

Значнае палепшаньне эканамічнага становішча працоўнага яўрэйскага насельніцтва і мяркуемыя Урадам Савецкай Беларусі мерапрыемствы для далей шага аздараўленьня даюць нам поўную ўпэўненасьць, што і ў далейшым дырэктывы партыі па вырашэньні мястэчковай праблемы будуць пасьпяхова ажыцьцёўлены.

Вялізарныя дасягненьні мы можам адзначыць таксама і ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі шляхам калектывізацыі беднацка-серадняцкіх гаспадарак польскага, латыскага, літоўскага насельніцтва і іншых нацменшасьцяй. Колькасьць калектывізаваных польскіх гаспадарак за апошнія два гады павялічылася амаль у пятнаццаць разоў—з 150 у 1929 г. да 2.219 у 1930 годзе і складае каля 20 проц. гаспадарак ўсяго польскага вясковага насельніцтва. Бядняцка-серадняцкія гаспадаркі латыскага насельніцтва калектывізаваны ў сярэднім да 30 проц. і літоўскага—да 38 проц. Гаспадаркі-ж татарскага насельніцтва ў мясцох кампактнага яго засяленьня калектывізаваны звыш як на 60 проц.

Культурнае разьвіцьцё нацменшасьцяй БССР на роднай мове працягвалася і ў апошнія два гады з нязьменнымі тэмпамі, чым агульна-культурнае будаўніцтва краіны.

Разам з ростам агульнай сеткі школ сацвыху значна вырасла таксама сетка яўрэйскіх, польскіх, літоўскіх, латыскіх і ўкраінскіх школ. Павялічылася сетка нацыянальных хат-чытален і чырвоных куткоў, арганізаваны яўрэйскае і польскае аддзяленьні рабфаку, ўтвораны яўрэйскі і польскі вандроўныя тэатры і яўрэйская дзяржаўная капэла. Асабліва буйна вырасла выдавецкая справа на нацмовах: за 1930 г. выдана Беларускім аддзяленьнем Цэнтравыдата каля паўмільёна экзэмпляраў розных кніг на нацмовах.

У Савецкай Беларусі на працягу гэтых год пасьлядоўна праводзілася палітыка інтэрнацыяналізацыі прадпрыемстваў. Нацыянальны склад рабочых цэнзаванай прамысловасьці ў 1930 г. вызначыўся ў наступным: беларусаў—47,3 проц., яўрэяў—37,6 проц., расійцаў—7,8 палякаў—4,8 і іншых 2,5 проц. Па паасобных галінах прамысловасьці нацыянальны склад рабочых хістаецца вельмі рэзка. Напрыклад, у папяровай, дрэваапрацоўчай, мэталюргічнай прамысловасьці і па апрацоўцы мінералаў пераважную колькасьць склада даюць беларусы; у паліграфічнай, швэйнай, скуранай і абутковай—яўрэі. Праводзімымі мерамі інтэрнацыяналізацыі прадпрыемстваў мы дабіліся некаторага павышэньня ўдзельнай вагі беларускіх рабочых, дзе пераважную колькасьць складалі яўрэі і наадварот—яўрэйскіх рабочых там, дзе пераважную колькасьць складалі беларусы, як напрыклад, у органах транспарту, сувязі і г. д.

Мы прыходзім да Х-га Зьезду Саветаў Беларусі з вышэйадзначанымі буйнымі дасягненьнямі, дзякуючы ўзмацненьню дыктатуры пралетарыяту, дзякуючы правільнай генэральнай лініі нашай партыі на індустрыялізацыю краіны, на сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі дзякуючы правільнай ленінскай нацыянальнай палітыкі, накіраванай да зьнішчэньня эканамічнай і культурнай няроўнасьці народаў.

Разгортваньне наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, пасьпяховае правядзеньне сацыялістычнае рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыя на базе суцэльнай калектывізацыі кулацтва як клясы, упартая барацьба за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў 1931 годзе праходзіць ва ўмовах напружанай клясавай барацьбы.

Рэшткі капіталістычных элемэнтаў і контр-рэвалюцыйнай буржуазнай інтэлігенцыі, пры дапамозе замежнай імпэрыялістычнай буржуазіі імкнуліся перашкодзіць ажыцьцяўленьню пяцігодкі ў чатыры гады, імкнуліся распаўсюдзіць свой уплыў ня толькі па эканамічнай лініі, але таксама і на ідэалёгічным фронце ва ўсіх галінах культурнага будаўніцтва.

Вялікадзяржаўныя шавіністы, контррэвалюцыйныя беларускія нацыянал-дэмакраты, нацыяналісты і шавіністы іншых колераў, зьмагаючыся з дыктатурай пралетарыяту за рэстаўрацыю капіталізму ў БССР, паставілі сваёй задачай перавесьці сельскую гаспадарку на шлях капіталістычнага разьвіцьця, а савецкую культуру БССР зрабіць нацыянальна-буржуазнай па зьмесьцу. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам Кампартыі вяла і вядзе бязьлітасную барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, выкрыла твар контр-рэволюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, выкрыла і разьбіла буржуазныя тэорыі, якія былі накіраваны на змаганьне з дыктатурай пралетарыяту за рэстаўрацыю капіталізму праз сувязь з контррэвалюцыйнымі элемэнтамі ў нашай краіне і з так званымі «беларускімі дзеячамі» буржуазнай фашыстоўскай Польшчы.

На сёньняшні дзень мы можам сказаць, што на шляху правільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі клясавы вораг разьбіты. Але было-б вялікай памылкай, калі-б мы лічылі, што ворагі, перашкаджаючыя правядзеньню і ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі, канчаткова дабіты. Нашы ворагі ў справе правядзеньня нацыянальнай палітыкі не склалі сваёй зброі. Прадбачачы блізкую пагібель, яны супраціўляюцца і будуць супраціўляцца з усёй сілай. Але пры максымальным уздыме энтузіязму і рэвалюцыйнай волі рабочых і ўсіх працоўных мас нашай краіны, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мы пераможам клясавага ворага Вядучы непрымірымую барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам як галоўнай небясьпекай мясцовымі нацыяналізмамі ўсіх колераў, з нацыянал апартунізмам і прымірэнцтвам да іх—мы забясьпечым у далейшым пасьпяховае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, накіраванай на эканамічны ўздым і шырокае разьвіцьцё савецкай культуры—нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце,

Г. Грысевіч

Прамысловасьць БССР ад IX да Х зьезду саветаў*)

Рабочае забясьпечаньне

Важнейшай задачай забясьпечаньня выкананьня прамфінпляну 31 г. зьяўляецца арганізацыя правільнага забясьпечаньня рабочых.

Гэта ня толькі работа раб. кааперацыі, але-ж і неадымная частка работы ўсіх прадпрыемстваў, саветаў і грамадзкіх арганізацый. Арганізацыя сталовак, закрытых разьмеркавальнікаў, адкормачных пунктаў—ўсё гэта павінна быць наладжана ў 31 г. Парт. і праф. арганізацыі павінны забясьпечыць масавы кантроль і дапамогу ў рабоце рабоч. каапэрацыі.

Зразумела, што выкананьня ўсіх гэтых задач магчыма толькі на грунце разьвіцьця сац. спаборніцтва, ударніцтва, пры правільнай арганізацыі вытворчых нарад, лепшага скарыстаньня рабочых прапаноў, каштоўных вынаходзтваў вылучэньня лепшых ударнікаў на кіруючую работу ў прадпрыемства.

Гэта асноўныя задачы, якія стаяць перад намі на працягу 1931 г.

Партыйныя, прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі і дэпутацкія групы саветаў павінны на прадпрыемствах ажывіць сваю працу, мабілізавацца самім, мабілізаваць усіх рабочых на выкананьне плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі. Працу ўсіх гспадарчых і масавых арганізацый партыя будзе расцэньваць ў адпаведнасьці з выкананьнем данным прадпрыемствам колькасных і якасных паказьнікаў.

На ажыцьцяўленьне усіх гэтых задач Х Усебеларускі Зьезд Саветаў павінен заклікаць рабочую клясу, усіх працоўных БССР.

Некаторыя пэрспэктывы разьвіцьця прамысловасьці БССР

У адносінах далейшага разьвіцьця прамысловасьці БССР, Зьезд Саветаў павінен абгаварыць наступныя задачы і пэрспэктывы. Асаблівая ўвага павінна быць зьвярнута на разьвіцьцё галін прамысловасьці, грунтуючыхся на мясцовай сыравіне, падвышаючы іх удзельную вагу. Разам з тым, паколькі абмежаваныя мясцовыя сыравінныя рэсурсы не забясьпечваюць дастатковага разьвіцьця прамысловасьці, павінны атрымаць далейшае разьвіцьцё тыя галіны, якія працуюць на прывознай транспарэнтабельнай сыравіне . **Асновай ў разьвіцьці прамысловасьці павінна стаць шырокае скарыстоўваньне мясцовай багатай паліўнай базы торфу і больш хуткае разгортваньне электрыфікацыі на скарыстоўваньні торфу.**

Торф зьяўляецца багацейшай паліўнай і сыравіннай базай БССР. Пераапрацоўка торфу пакуль знаходзіцца яшчэ ў самым зачатку Удзельная вага спажываньня торфу рэспубліканскай прамысловасьцю па адносінах да паліўнага балянсу складала ў 28-29 8,7 проц., у 29-30—12,4 прац. а на 1931 год намечаны 28 проц. Здабыча торфу на паліва раўнялася ў 26-27 г. 0,014 проц. ўсіх запасаў; у 28-29 г.—0,020 проц. і ў 29-30 г.—0,025 проц. усіх запасаў. На 1931 г. праграма, зацьверджаная ВСНГ СССР, прадугледжвае здабычу каля 600 тыс. тон, альбо 0,048 проц. запасу.

Павінна быць пастаўлена ва ўсю шырыню задача максымальнага павялічэньня здабычы торфу ў першую чаргу для скарыстоўваньня ў якасьці паліва для прамысловасьці гарадоў і сельскае гаспадаркі, адзінай паліўнай базы электрыфікацыі БССР і сыравіны для прамысловай пераапрацоўкі.

Разьвіцьцё лясной прамысловасьці за апошнія гады дасягнула значных разьмераў. Асноўнымі задачамі ў лясной гаспадарцы павінна быць упарадкаваньне яе, правільная арганізацыя лясной гаспадаркі, рацыянальнае вядзеньне яе, асваеньне недастаткова асвоеных масываў, а таксама скарыстаньне адкідаў лясной гаспадаркі. У адносінах лесараспрацовак і лесавывазкі, асноўнымі задачамі зьяўляюцца: правільная арганізацыя працы, мэханізацыя гэтых работ, будаўніцтва чыгуначных ветак.

На базе маючайся ў БССР мінэральнай сыравіны павінна быць шырока разгорнута вытворчасьць будаўнічых матар'ялаў у мэтах здавальненьня патрэбы ў іх з боку прамысловасьці, сельска-гасп. і камунальн. будаўніцтва. Неабходна фарсіраваць цагельную прамысловасьць, цэмантную, кахляна-плітачную, а таксама арганізацыю керамічнай, вапеннай, крэйдавай і пашырэньне клінкернай вытворчасьці для патрэб шляхавага будаўніцтва і гарадоў. На базе мясцовай мінэральнай сыравіны павінна быць організавана ў бягучым годзе вытворчасьць агнетрывалай цэглы, а таксама будаўніцтва мэханізаваных шкляных заводаў.

Улічваючы маючыеся вялікія запасы фасфарытаў, неабходна разгарнуць вытворчасьць фасфарытнай мукі для патрэб сельскай гаспадаркі.

Асаблівая ўвага павінна быць удзелена разьвіцьцю ільна-апрацоўчай прамысловасьці БССР, маючай дастатковую сыравінную базу для свайго фарсіраванага разьвіцьця, бо БССР зьяўляецца адным з асноўных ільняных раёнаў СССР.

У сувязі з разгортваньнем канапляводзтва на мэліяраваных плошчах, павінна быць вырашана задача будаўніцтва пенька-апрацоўчых фабрык і заводаў па першапачатковай апрацоўцы валакністых культур.

Сельска-гаспадарчая спэцыялізацыя БССР, як раёну тэхнічных культур, і жывёлаводзтва, падводзіць сыравінную базу пад разьвіцьцё скурана-абутковай прамысловасьці, якая пры далейшым разьвіцьці жывёлаводзтва, асабліва сьвінаводзтва, будзе мець ўсё даньня для свайго разьвіцьця. У скурана-абутковай прамысловасьці далейшае разьвіцьцё павінна ісьці па шляху пашырэньня скуранай вытворчасьці, у прыватнасьці, пераапрацоўкі сьвіных скур, арганізацыі сырамятнай вытворчасьці, разьвіцьця новай вытворчасьці па пераапрацоўцы скурана-сьвіных фабрыкатаў (галянтарэя, рымарна-сядзельная вытворчасьць), а таксама па лініі разьвіцьця абутковай вытворчасьці—будаўніцтва новых фабрык.

Мэталпрамысловасьць павінна ісьці па шляху здавальненьня ў асноўным патрэб народнае гаспадаркі БССР і сумежных эканамічна блізкіх раёнаў. У агульным машынабудаўніцтве павінна разьвівацца вытворчасьць торфамашын, гарнітур для цагельных заводаў, будмэханізацыі—лябёдак, растворамяшалак, правіяфартыровак, камядрабілак, варштатаў, а таксама мэханізмаў для вытворства шляхавых і меліярацыйных работ, што абумоўлівае будаўніцтва новага заводу сярэдняга машынабудаўніцтва.

У адносінах сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва павінен быць узяты курс на абслугоўваньне патрэб аграмаджанага сэктару, у адпаведнасьці з сельска-гаспадарчай спэцыялізацыяй БССР.

Швэйная прамысловасьць мае таксама ўсе даныя для захаваньня узятых тэмпаў яе разьвіцьця, для закончваньня пачатых капітальных работ і пашырэньня пераапрацоўкі бавоўна-папяровых тканій для масавага спажываньня, асабліва ў сельскай гаспадарцы, выпуску дзіцячага асартымэнту і спэцвопраткі.

Побач з швэйнай прамысловасьцю павінна разьвівацца і панчошна-трыкатажная.

Энэргагаспадарка БССР рэзка адстае ад агульнага разьвіцьця прамысловасьці. Пуск і Белдрэс імя Сталіна толькі ў вядомай ступені здавальняе патрэбы Усходняй часткі БССР. Але разам з тым надзвычайна востра стаіць пытаньне аб электразабясьпечаньні прамысловых прадпрыемстваў Гомельскага, Менскага, Бабруйскага раёнаў і іншых гарадоў БССР, дзе маюць месца прастоі прадпрыемстваў з-за недахопу ў электраэнэргіі. Неабходна максымальна фарсіраваць будаўніцтва, цёплаэлектрацэнтралі ў Менску, павінна быць пачата будаўніцтва 2-й чаргі Асінбуду і 2-ой Гомельск. Рэйлектрастанцыі.

Насычанасьць прампрадпрыемстваў ВСНГ БССР тэхкадрамі складае ад 15—30 проц. нармальнай штатнай патрэбы, выпуск-жа спэцыялістых з навучальных устаноў БССР будзе толькі ў канцы апошняга году пяцігодкі, да гэтага часу папаўненьне тэхкадрамі павінна ісьці рознага роду унешкольнымі формамі адукацыі, як-та: завочнымі, курсавымі і інш., а галоўным чынам за рахунак агульна-прамысловых кадраў ВСНГ СССР.

Арганізаваныя ў восені 1930 г. 4 ВТНУ 3 Тэхнікумы не здаволены абодвымі навучальнымі і жыльлёвымі памяшканьнямі для нармальнага разгортваньня сваёй работы. Слабасьць іх абсталяваньня не забясьпечвае падрыхтоўку поўнацэннага спэцыялістага.

Акрамя таго, існуючая сетка навучальных устаноў не вырашае пытаньня падрыхтоўкі для БССР неабходных тэхнічных кадраў.

Вось некаторыя пэрспэктывы разьвіцьця асноўных галін прамысловасьці БССР, якія прадстаўляюцца на абгаварэньне Х Зьезда Саветаў.

Пад кіраўніцтвам партыі за завяршэньне пабудовы фундамэнту сацэканомікі

Ня гледзячы на ўсе шкодніцтва, якое мы мелі ў прамысловасьці, ня гледзячы на перашкоды і цяжкасьці на нашым шляху, выклікаемыя бурным ростам ўсёй народнай гаспадаркі, ня гледзячы на тое, што кулацкая агентура—правыя і «левыя» апартуністы выступалі і выступаюць супроць узятых тэмпаў, мы маем вялізарны рост індустрыялізацыі БССР. Буйнымі крокамі мы ідзём ўперад, ідзём упэўнена і цьвёрда, маючы перад сабой багатыя і рэальныя пэрспэктывы. У гэты трэці год—рашаючы год нашай пяцігодкі—мы павінны выканаць усе тыя пляны, што мы запраектавалі. Для гэтага трэба мабілізаваць рабочую клясу, усе яе арганізацыі, апарат—зьверху да нізу на выкананьне і перавыкананьне высунутых задач 1931 г.

Пад кіраўніцтвам партыі і яе Ленінскага ЦК ў рашучым наступленьні па ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, мы ў 1931 годзе сапраўды пабудуем фундамант сацыялістычнай эканомікі.

*) Працяг. Пачатак гл. «С. Б» № 42.

За Х-га Усебеларускага зьезду саветаў
Трыбуна прапаноў

48 т. Азарыцкі

Рабочы заводу «Бальшавік».

90. Х Усебеларускі зьезд саветаў павінен даць дырэктывы Наркамасьветы пабудаваць узорную школу, каб яна была паказальнай у справе палітэхнізацыі для ўсіх школ БССР.

91. Саветы павінны палепшыць культурнае абслугоўваньне калгасаў шляхам пашырэньня сеткі культурна-бытавых устаноў.

49 т. Макарчук

Настаўнік Грэскага раёну.

92. Х зьезд павінен даць дырэктывы аб заканчэньні да канца 1931 году спэцыялізацыі раёнаў па БССР.

93. Даць дырэктывы каб ніводная школа ня была не пераведзенай на палітэхнічныя рэйкі да канца 1931 году.

94. Шырока арганізаваць справу перападрыхтоўкі настаўніцтва па пытаньні палітэхнізацыі школы.

50 т. Сержанін

Настаўнік Лагойскага раёну.

95. На працягу 1931 году пашырыць сетку школ калгаснай моладзі і вячэрніх школ калгаснай моладзі для пераросткаў. Асыгнаваць поўныя сродкі на будаўніцтва будынкаў для гэтых школ.

96. Даць дырэктывы НКА сваячасова забясьпечыць да новага навучальнага году клясава-вытрыманымі падручнікамі школы.

51 т. Шыёнак

Віцебскага раёну.

97. Для хутчэйшай ліквідацыі прарываў у справе палітэхнізацыі выдаць закон аб палітэхнічнай школе, папярэдня абгаварыўшы яго ў шырокіх рабочых і працоўных масах.

98. Даць дырэктывы аб канчатковым устанаўленьні адзінага пляну культработы.

99. Х зьезд саветаў павінен вырашыць пытаньне аб прыраўненьні гарадзкіх настаўнікаў, асабліва пачатковых школ, у справе забесьпячэньня па нормах рабочых, да вясковага настаўніцтва.

52 т. Ларычкаў

Ваенкор АБВШ.

100. Арганізаваць для батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі курсы па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы, забясьпечыўшы курсантаў стыпэндыямі.

101. У буйных прамысловых гарадох БССР пабудаваць тэатры рабочай моладзі.

102. Да кожнага калгасу прымацаваць адпаведныя зьвеньні прадпрыемстваў для аказаньня дапамогі калгасам рабочымі даных прадпрыемстваў.

103. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на культурнае і бытавое абслугоўваньне рабочых сэзоньнікаў лесасплаўных і лесазагатоўчых работ.

104. Упарадкаваць дарожную гаспадарку БССР, асабліва дарогі мясцовага значэньня.

105. Для перанясеньня вопыту работы калгасаў буйных раёнаў СССР ў БССР наладжваць экскурсіі калгасьнікаў і аднаасобнікаў - беднякоў і серадняков на Паўночны Каўказ, Ніжнюю Волгу і інш. месцы Савецкага Саюзу.

106. Нязрытодныя для ворыва плошчы зямлі ў межах саўгаскіх і калгасных палёў, засаджваць дрэвамі.

107. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на пашырэньне конязводзтва ў БССР, павялічыўшы колькасьць конзаводаў.

53 т. Лазюк З. і Шавялёў І.

Курсанты АБВШ.

108. У буйных саўгасах і калгасах пабудаваць электрастанцыі.

109. У кожным сельсавеце БССР павялічыць колькасьць хат-чытальняў з платнымі хатнікамі.

110. Узмацніць пажарную ахову саўгасаў і калгасаў праз стварэньне пажарных дружын і забясьпечаньне іх інвэнтаром.

111. Вызначыць фонд прэміраваньня лепшых членаў с.-с. ударнікаў, якія выконваюць усе заданьні партыі і ўраду.

112. Зьвярнуць увагу на агнетрывалае і глінабітоннае будаўніцтва у раёнах БССР.

113. Пабудаваць сталоўкі ў рабочых пасёлках, а таксама пашырыць каапэрацыйную сетку па акраінах гарадоў БССР.

114. Зьвярнуць належную ўвагу на палепшаньне санітарнага становішча калгасьнікаў і саўгасьнікаў.

РАПАРТУЮЦЬ МІЛЬЁНЫ

Вартавыя варштатаў энтузіясты пяцігодкі рапартуюць гаспадару БССР X Зьезду Саветаў

Рапарт перамог

Будзем моцна трымаць сьцяг ЦК КП(б)Б

Рабочыя, служачыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал заводу «Пралетары» шле сваё гарачае прывітаньне X Усебеларускаму зьезду Саветаў і першаму пленуму гарадзкога савету 13-га скліканьня.

Наш завод быў і будзе заўсёды моцнай крэпасьцю партыі ў барацьбе за ленінскае адзінства, ў барацьбе за генэральную лінію партыі супроць малавераў, апартуністаў.

Пад кіраўніцтвам партыі мы рашуча змагаліся з правым апартунізмам, як з галоўнай небясьпекай на гэтым этапе, цягнуўшай наш завод да чорнай дошкі.

Першы квартал другога году пяцігодкі быў выканан на 83 проц. Апартуністычнае кіраўніцтва заводу не магло мабілізаваць увагу мас на барацьбу за прамфінплян. Было зьнята права-апартуністычнае кіраўніцтва, зьменен увесь заводзкі трыкутнік.

З праявамі права-апартуністычнай практыкі, рабочым заводу «Пралетары» прыходзілася сустракацца на працягу усяго году і асобнага кварталу некалькі разоў і толькі ў бязьлітаснай барацьбе з правым апартунізмам,—рабочыя заводу «Пралетары» ліквідавалі прарыў першага кварталу другога году пяцігодкі, сталі на шлях выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, ажыцьцяўляючы на справе генэральную лінію партыі. У выніку чаго другі год пяцігодкі быў скончаны з выкананьнем прамфінпляну на 102,3 проц. Рабочым калектывам высунуты сустрэчны прамфінплян на 1930—31 год, і замест 4.400.000 руб. намечаных гаспадкіраўніцтвам узята—5.530.000 руб.

Верасень месяц—быў месяцам праверкі рэальнасьці сустрэчнага прамфінпляну, а таксама месяцам падрыхтоўкі заводу да асобнага кварталу. Рабочыя ў гэты месяц высунулі дадатковы сустрэчны, павялічыўшы прамфінплян яшчэ на 384.000 руб. (6,9 проц. павялічэньня).

Завод уключыўся ва ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства. Быў аб'яўлен унутры-заводзкі конкурс, які паслужыў лепшым сродкам барацьбы за першынства ва Ўсесаюзным конкурсе.

Плян асобнага кварталу выканан за 6 дзён да тэрміну, медна-ліцейны цэх скончыў праграму за 12 дзён раней да тэрміну, мэханічны цэх за 9 дзён да тэрміну і г. д. Цалкам завод прамфінплян асобнага кварталу выканаў на 108,3 проц., перайшоў на 7-гадзінны рабочы дзень.

Цэнтр цяжкасьці быў перанесены на ўдарныя брыгады і групы. З 20 сьнежня праводзілася праверачная дэкада, быў распрацаваны сустрэчны прамфінплян на 1931 г., які павялічаны супроць наметак Белмэтальаб'яднаньня на 17,8 проц.

Ударным рухам ахоплена 85 проц. рабочых заводу.

Кацельны цэх яшчэ 6 красавіка аб'явіў сябе ўдарным-камуністычным. Ён на справе апраўдаў сваю назву. Ён атрымаў пераходны заводзкі сьцяг другога году пяцігодкі.

У чэрвені месяцы мэханічны цэх аб'явіў сябе камуністычным. Упяршыню па БССР на нашым заводзе былі арганізаваны скразныя брыгады, вопыт якіх быў перанесены на другія прадпрыемствы.

У аснову ўсяе работы пакладзены мэтад сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і збор прапаноў рабочых.

У другім годзе пяцігодкі ад прапаноў рабочых завод атрымаў эканоміі—73.600 руб. У чысьле ўнесяных прапаноў ёсьць такія вялікія, як ўпрапчэньне растворамяшалкі, што дае гадавую эканомію 100.000 руб.

У сучасны момант ўнесяна і правяраецца на зопыце прапанова, якая дасьць эканомію заводу у 70.000 руб. ў год.

У асобным квартале эканомія ад прапаноў рабочых дала 126.322 руб. Распрацаваны рацыяналізатарскі плян на 1931 год прадугледжвае эканомію на 150.000 руб. Абвешчана рашучая барацьба браку. На заводзе арганізаваны 4 брыгады узорнай якасьці. Па ініцыятыве ліцейшчыкаў была склікана агульна-гарадзкая канфэрэнцыя ліцейшчыкаў.

Падпіска на пазыку «Пяцігодка ў чатыры гады» выканана на 107,75 проц.

Дадатковая падпіска на пазыку дала—7.750 руб. Рабочыя пастанавілі датэрмінова выкупіць аблігацыі пазыкі. Наш завод даў у рады камуністычнай партыі 130 лепшых рабочых-ударнікаў.

У час вясновай пасеўнай кампаніі ў вёскі была накіравана некалькі рабочых брыгад па рамонту сельскагаспадарчага інвэнтару.

Завод даў вытрыманых рабочых і ў лік 25-тысячнікаў, якія перанесьлі вопыт сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасы.

У сучасны момант завод па-бальшавіцку рыхтуецца да веснавой сяўбы. Накіравана брыгада па рамонту сельгас інвэнтару.

Рабочыя прынялі пастанову аб адлічэньні 2 проц. з зарплаты у фонд пасеўнай кампаніі. На заводзе перабудоўваецца шэфработа. Кожны цэх, кожная ударная брыгада, будзе мець падшэфны сельсавет, падшэфны калгас.

За бальшавіцкія тэмпы па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну, па мабілізацыі мас на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за рашучую барацьбу з правымі апартуністамі,—завод атрымаў пераходны сьцяг асобнага кварталу імя ЦК КП(б)Б.

У нас яшчэ ёсьць цэлы рад недахопаў, асабліва стаіць дрэнна з якасьцю прадукцыі. Шмат браку, плянавасьць на заводзе не на належнай вышыні. Ёсьць яшчэ шмат прагулаў і спазьненьняў на заводзе.

Мы цяпер пераживаем часовыя цяжкасьці з забесьпячэньнем сыравінай, што адбіваецца на выкананьні пляну бягучых месяцаў. Але, ня гледзячы на гэта, мы—рабочыя, служачыя і адм.-тэхнічны пэрсанал заводу «Пралетары» запэўніваем X Усебеларускі зьезд саветаў і першы пленум гарсавету, што пад кіраўніцтвам парткалектыву будзем рашуча змагацца з апартуністамі, малаверамі, спрабуючыя ўсімі крокамі затармазіць пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва.

Мы завяраем X Усебеларускі зьезд саветаў, што пад кіраўніцтвам партыі будзем моцна трымаць сьцяг ЦК КП(б)Б. Наш лёзунг—«Пераходны сьцяг ЦК павінен застацца на заводзе».

Мы далі ў дэпутаты гарсавету лепшых ўдарнікаў заводу. Мы прымем усе захады, каб дапамагчы гарсавету стаць ударным ва ўсёй яго практычнай рабоце.

Ад брыгады заводу да СНК БССР будзем работаць па ўдарнаму, ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі.

Пад кіраўніцтвам партыі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі пабудуем фундамэнт сацыялістычнай экономікі СССР.

Няхай жыве камуністычная партыя пад кіраўніцтвам якой рабочая кляса пасьпяхова будуе сацыялізм!

Сход рабочых заводу «Пралетары».

Лыжная эстафэта X Зьезду Саветаў падыходзіць да фінішу

Усебеларуская лыжная эстафэта працоўных дасягненьняў і гатоўнасьці да абароны краіны ў гонар X зьезду Саветаў БССР падыходзіць да свайго фінішу.

Паводле атрыманых зьвестак арг. камітэту пры ВСФКБ лыжная эстафэта з апошніх этапаў (кустоў) вышла 15 лютага ў 12 гадз. дня з Гомеля, 17 лютага ў 10 гадз. раніцы з Мазыра, 17 лютага ў 12 гадз. дня з Магілёва, 17 лютага ў 1 гадз. дня з Полацку, 17 лютага ў 5 гадз. вечара з Воршы. Старты выхаду з астатніх кустоў чакаецца сёньня і заўтра.

Удзельнікі лыжнай эстафэты нясуць рапарты X-му Ўсебеларускаму зьезду Саветаў аб дасягненьнях сацбудаўніцтва фабрык, заводаў, калгасаў і саўгасаў.

100 новых калгасаў арганізавана ў Копыскім раёне

Па Копыскім раёне за апошні час арганізавана 100 новых калгасаў. Такіх дасягненьняў раён дамогся праз шырокую растлумачальную працу на вёсцы і ўзорную работу старых калгасаў.

Меліся спробы клясавага ворага сарваць Ленінскі заклік у калгасы, але моцна згуртаванае бядняцка-серадняцкае ядро пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый і пры дапамозе савецкіх устаноў дало спробам кулацтва належны бальшавіцкі адпор.

А. Генін.

Масавы прыліў у калгасы

(па тэлеграфе ад нашага карэсп.)

МАГІЛЁЎ. 20-II. Дэлегаты VI Магілеўскага раённага зьезду саветаў з гонарам вынонваюць узятыя на сябе абавязацельствы ў парадку «Рапарту мільёнаў».

Брыгада калгаснікаў калгасу «Адраджэньне» свае абавязацельства завярбаваць да X Усебеларускага зьезду саветаў ў калгас 10 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак перавыканала на 70 проц. Дэлегаты зьезду з Цішаўскага сельсавету арганізавалі 3 калгасы. Па Вендараскім сельсавеце да X Усебеларускага зьезду саветаў улілося ў калгасы 228 гаспадарак, сельсавет калектывізаваны ўжо на 40 проц.

Масавы прыліў у калгасы працягваецца.

А НЁМАНСКІ.

Увага

Зьмешчаны ў мінулым нумары нашае газэты, на 3 старонцы, рапарт пад загалоўкам—«Пакладзем усе сілы, ўвесь свой энтузіязм на барацьбу за выкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага»—зьяўляецца рапартам рабочых, тэхпэрсаналу і служачых Чырвонаштандарнага заводу «Бальшавік» (Менск).

Аб пераможных тэмпах у барацьбе за другую калгасную дакладваюць зьезду ўдарнікі палёў

Ударны Грычынскі сельсавет абавязуецца па-бальшавіцку правесьці веснавую сяўбу

У гонар X-му Усебеларускаму Зьезду Саветаў, мы—члены Грычынскага сельсавету, б. Самахвалаўскага раёну, у адказ на шалёную шкодніцкую дзейнасьць і агітацыю з боку кулацкіх элемэнтаў супроць калектывізацыі,—абвяшчаем сябе ўдарнікамі па бальшавіцкай падрыхтоўцы да другой калгаснай вясны, бяручы на сябе наступныя абавязкі:

1. Кожны з нас, які яшчэ не зьяўляецца калгасьнікам, абавязуецца да вясновай сяўбы з усей сваёй сям'ёй уступіць на добраахвотных пачатках ў калгас.

2. Кожны з нас абавязуецца шырока разгарнуць па добраахвотных пачатках вярбоўку ў калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак з тым, каб да другой бальшавіцкай вясны павялічыць калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па сельсавеце з 40 да 60 проц., а да канца 1931 году ў асноўным закончыць калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па Грычынскім сельсавеце.

3. Мы абавязуемся да вясновай сяўбы дабіцца рашучай зьмены ў напрамку паляводства па нашым сельсавеце дабіцца падвядзеньня пад нашы калгасы моцнай кармовай базы і перапрацоўваньня калгасаў ў буйныя фабрыкі малака і мяса для пралетарыяту нашай краіны саветаў.

Няхай жыве Ленінскі ЦК КП(б)Б—арганізатар і кіраўнік калгаснага руху!

Няхай жыве трэці рашаючы год пяцігодкі, год апошніх рашаючых бояк з рэшткамі капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі, год магутнага калгаснага прыліву, год ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, год завяршэньня пабудовы фундамэнту сацыялістычнай экономікі СССР!

Няхай жыве X Усебеларускі Зьезд Саветаў!

Старшыня Грычынскага сельсавету **Варотч.**

Члены сельсавету: **Барысевіч, Хадаркевіч, Дзявочка, Лічко, Сідранскі, Дземновіч, Маліноўскі, Рублеўскі, Чарновіч, Тарайковіч, Міранович, Гарачка.**

Старшыня с.-гасп. камісіі пры сельсавеце аграном **Маркаў.**

Падыходзім да зьезду саветаў з вялізарнымі дасягненьнямі

Калгас «Камуніст» падыходзіць да X Усебеларускага Зьезду Саветаў з шэрагам значных дасягненьняў, якія зьявіліся ў выніку правільнага і няўхільнага правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў партыі і ўлады, дзякуючы актыўнасьці і энтузіязму калгасных мас.

Калгасам складзены і шырока абгавораны вытворчы плян і плян веснавой пасеўнай кампаніі. Створаны страхавы насенны фонд, закончан рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара.

За апошні час калгас мае прыліў у лік 10 гаспадарак. Калгасам створана вярбовачная брыгада, якая паставіла перад сабой задачу да пачатку веснавой сяўбы завербаваць у калгас 40 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Распрацоўваючы плян веснавой пасеўнай кампаніі, калгасьнікі далі свой сустрэчны пасеўны плян, які на 2 га па вялічвае яравы засеў супроць пляну, дадзенага калгасу раёнам. Для веснавой сяўбы нарыхтавана 600 тон торфу, насеньне ўжо ачышчана.

Рапартуючы X Усебеларускаму Зьезду Саветаў аб сваіх дасягненьнях, калгас абвяшчае сябе ўдарным па выкананьні пляну веснавой сяўбы, па арганізацыі шырокага прыліву ў калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і выклікае да спаборніцтва калгасы «Сьвет» і «Чырвоны Кастрычнік» Бабруйскага раёну.

Ад імя калгасу старшыня калгасу **САЎЧАНКА.**

Выканаем і перавыканаем плян бальшавіцкай сяўбы

Калгас «Сьвет» рапартуе X-му Ўсебеларускаму Зьезду Саветаў аб сваёй працы і бальшавіцкай падрыхтоўцы да другой калгаснай вясны, зазначаючы, што калгасам:

1. Насенны фонд створаны поўнасьцю.

2. Сельска-гаспадарчы інвэнтар, патрэбны для веснавой сяўбы, адрамантаваны. Калгас прыступіў да рамонту збруі і калёс.

3. У бліжэйшыя дні калгас закончвае пабудову дамоў для калгасьнікаў на шэсьць сямей; закончвае памяшканьне для дзіцячых яселяў; рыхтуе матар'ял для будаўніцтва трох новых дамоў-кватэр для калгасьнікаў.

4. Да канца працы X-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў калгас абавязваецца скончыць пабудову сьвінарніка на 55 сьвінаматак і загатовіць будаўнічы матар'ял для пабудовы другога сьвінарніка.

5. З першага сакавіка калгас прыступае да пабудовы артызіянскай студні.

6. Калгас ставіць перад сабой баявую задачу-ўцягнуць да веснавой сяўбы ў рады калгасьнікаў 60 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

7. Калгас «Сьвет» завярае X Усебеларускі Зьезд Саветаў, што плян вясновай сяўбы ня толькі будзе выканаты, але і перавыкананы.

Адначасова з гэтым калгас заяўляе X-му Ўсебеларускаму Зьезду Саветаў аб маючыхся ў яго працы недахопах і прарывах: яшчэ недастаткова наладжаны вучот працы, слаба вядзецца культмасавая работа сярод калгасьнікаў, недастаткова ўвагі аддаецца спэцыяльным галінам гаспадаркі, наглядаюцца выпадкі прагулаў з боку калгасьнікаў.

Гэтыя недахопы калгас абавязуецца ў самы бліжэйшы час ліквідаваць, каб па-бальшавіцку, у поўным узброеньні, сустрэць другую калгасную вясну.

Няхай жыве X-ты Ўсебеларускі Зьезд Саветаў!

Няхай жыве КП(б)Б—кіраўнік сацыялістычнай перабудовы вёскі!

Калгасьнікі.

Бабруйскі раён.

Камуна імя X-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі--рапартуе

Наша камуна арганізавана ў пачатку 1928 году ў складзе 5 бядняцкіх і трох серадняцкіх гаспадарак з вёскі Кашына, Машкоўскага сельсавету (Аршаншчына).

Сродкі вытворчасьці камуны спачатку былі вельмі нязначныя. Мелася зямлі 101 га, 7 кароў, 8 коняй, 1 сьвіньня і дробны сялянскі інвэнтар. Усёй абагуленай маемасьці было толькі на 4000 руб.

Тав. Стаховіч—старшыня камуны імя X годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву кампартыі, вялікай зацікаўленасьці камунараў за тры гады свайго існаваньня камуна дабілася значных посьпехаў і стала прыкладам для бядняцка-серадняцкага вакольнага сялянства.

На сёньняшні дзень камуна налічвае ў сваім складзе 29 гаспадарак, мае 507 га зямлі, 21 каня, 74 каровы, 136 сьвіней і 24 авечкі. Камуна ўзяла напрамак спэцыялізацыі на сьвінагадоўлі. Сьвінаматкамі гаспадарка камуны ўкамплектавана звыш 100 проц. пляну.

Пабудавана абора, хлебныя і фуражныя будынкі. Маецца сыраварня і майстэрні па вырабу агнетрывалых матар'ялаў. Наладжана агульная сталоўка. Канчаецца пабудова школы і сьвінарніка на 96 сьвінаматак. Кошт асноўных сродкаў вытворчасьці вырас да 42 тысяч рублёў. У парадку сустрэчнага пляну яравы клін вызначан у 293 га. У лік кармовых культур будзе засеяна сіласнымі 18 га і коранплодамі 14 га. Пад агарод адводзіцца 5 гектараў.

У справе падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны камуна не адстае. Ужо цалкам засыпана маючаеся насеньне, канчаецца рамонт інвэнтару, забраніраваны ў дастатковай колькасьці фуражныя фонды.

У адказ на адозву ЦК ЎсеКП(б) і СНК СССР мы закантрактавалі сто галоў сьвіней.

Пераканаўшыся на справе ў тым, што калгасная гаспадарка для бедняка і серадняка адзіны выхад з цемры, галечы і занядаду, камунары заклікаюць бядняцка-серадняцкае сялянства індывідуальнага сэктару выйсьці ў другую бальшавіцкую вясну ў поле дружнай калектыўнай сям'ёй. Толькі гэтым шляхам мы пераможам усе цяжкасьці, зьліквідуем кулацтва як клясу і пойдзем шпаркімі тэмпамі да сацыялізму.

Ад імя камунараў: Старшыня камуны СТАХОВІЧ.

Камунары: Лабуноў, Анкіновіч Лукер'я.

З посьпехам выканаем прамфінплян трэцяга рашаючага

Чырвонаштандарны машынабудаўнічы завод „Энэргія" X Усебеларускаму зьезду саветаў рапартуе:

Дзякуючы шырокаму разгортваньню сацыялістычных мэтадаў працы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рабочыя чырвонаштандарнага машынабудаўнічага заводу «Энэргія «пад правільным і няўхільным кіраўніцтвам партколектыву і прафарганізацыі, даючы адпор правым і «левым» апартуністам, мабілізуючы рабочыя масы заводу на выкананьне бальшавіцкіх тэмпаў работы, пасьпяхова выканалі прамфінплян ударнага кварталу.

Уступіўшы ў трэці рашаючы год пяцігодкі, які павінен завяршыць пабудову фундаманту сацыялізму і эканомікі СССР, рабочыя заводу «Энэргія» у трэцім годзе пяцігодкі не паслабляючы сваіх ударных тэмпаў работы—пасьпяхова выканаюць прамфінплян трэцяга рашаючага.

За студзень месяц першага кварталу 1931 году на заводзе арганізавана 4 вытворча-бытавых камуны, павялічыўся лік ударнікаў на 48 чалавек, камунай грушчыкаў зьніжаны расцэнкі на 5 проц.

З 1-га лютага завод уключыўся ў барацьбу за якасьць прадукцыі, арганізаваны спэцыяльныя брыгады па барацьбе з бракам.

Рабочыя заводу таксама ўключыліся ў месячнік барацьбы за рацыяналізацыю, які ставіць сваёй мэтаю лепшую арганізацыю вытворчасьці, павялічэньне прадукцыйнасьці працы, рацыянальнае скарыстоўваньне сыравіны, апалу і матар'ялаў, барацьбу са стратамі ў вытворчасьці.

З 1-га студзеня ад рабочых заводу паступіла 84 рабочых прапановы з іх праведзена ў жыцьцё 19, распрацоўваецца 59.

З гэтымі дасягненьнямі мы падыйшлі да X Усебеларускага зьезду саветаў і абяцаем, што пад кіраўніцтвам нашай ленінскай камуністычнай партыі будзем няўхільна змагацца за выкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Няхай жыве X Усебеларускі зьезд саветаў!

Няхай жыве Ленінская камуністычная партыя (бальшавікоў) і яе ЦК.

VI зьезду Саветаў Быхаўшчыны | Рапарт | X Зьезду Саветаў БССР

Рабочых саўгасу „Чырвоны Маяк"

VI зьезду Саветаў Быхаўшчыны, зьезду Саветаў БССР—рабочы калектыў сьвінаводнага саўгасу «Чырвоны Маяк» шле сваё прывітаньне.

Будаўніцтва гаспадаркі распачата з мая месяца 1930 г. За гэты кароткі час дасягнута наступнае:

1. У галіне будаўніцтва фабрыкі мяса:

а) Пабудаван і ўкамплектаван адзін і заканчваецца пабудовай другі сьвінарнік на 96 галоў кожны;

б) Разгорнута будаўніцтва яшчэ 2-х такіх-жа матачнікаў;

в) Выведзены сьцены 2-хпарасятнікаў на 440 гал.;

г) Пабудавана часовая кухня для сьвіней і абсталяван карантын на 200 галоў;

д) У сьвінарніку пастаўлена (да 29 студзеня) 151 сьвінаматка, у карантыне 40 галоў.

2. Рост гаспадаркі: пасеўная плошча саўгасу—816 га (уся плошча—1216 га). Маецца—6 трактараў, 2 складаных малатаркі, статак кароў у 64 галавы, коняй—33.

Мы, рабочыя, запэўніваем зьезды, што, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, прамфінплян 3-га рашаючага году пяцігодкі выканаем. Абяцаем выканаць будаўніцтва:

а) 8 адкормачнікаў па 300 галоў кожны;

б) Закончыць распачатыя і ўноў пабудаваць яшчэ 9 розных сьвінаматачнікаў;

в) Цэнтральнай кухні для сьвіней;

г) Стайні і кароўніка;

д) Амбару, гумна, лазьні, пральні;

е) 4-х двух-павярховых дамоў; клюбу, вадаправоду.

Вядучы падрыхтоўку да 2-ой бальшавіцкай сяўбы, дапамагаючы ў гэтым калгасам і паасобнікам, мы, рабочыя, будзем змагацца за новы калгасны прыліў, за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на яе аснове кулацтва, як клясы.

Агульны сход рабочых.

Сяляне, беднякі і серадняк і аднаасобнікі падаюць заявы аб прыёме іх у калгас «Чырвоны Араты», Каралінскага р.

Па шляху „Савецкай эстафэты"

РАЁНЫ РАПАРТУЮЦЬ

Аказана значная дапамога сельсаветам

Старадароскі раён

Пасьля прапрацоўкі пытаньня аб уключэньні Старадароскага раёну ў савецкую эстафэту на РК КП(б)Б, а таксама на прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацыях Старадароскі РВК вынес данае пытаньне на абгаварэньне Райвыборчай камісіі. Райвыбарчая камісія прыняла пастанову аб уключэньні раёну ў савецкую эстафэту з мэтай правядзеньня якой быў мабілізаваны раённы партыйны, камсамольскі і прафэсыянальны актыў у ліку 45 чал.

У раёне было арганізавана 12 брыгад, якія і былі накіраваны ў сельсаветы. Брыгады ў сельсаветах, абгаварыўшы пытаньне з сельсаветам і грамадзкімі арганізацыямі, мабілізавалі мясцовы вясковы актыў, з якога арганізаваны брыгады па асобных маршрутах. Брыгады па асобных маршрутах правялі праверку працы сельсаветаў

У часы савецкай эстафэты ў раёне арганізавана 8 новых калгасаў і ўлілося ў старыя калгасы 117 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Адозва ЦВК была зачытана і растлумачана працоўнаму насельніцтву на агульных сходах па ўсіх вёсках, у некаторых вёсках брыгады вучняў і камсамольцаў рабілі падворны абход, дзе і зачытвалі адозву.

Эстафэта аказала значную дапамогу сельсаветам у напрамку наладжваньня іх работы і выпраўленьня памылак і зьнішчэньня перагібаў.

Ударнікаў эстафэты ў раёне было 78 чалавек, якія працавалі па-бальшавіцку.

Эстафэта зьявілася добрым штурмам па выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній. У часе працы брыгад эстафэты па ўсіх кампаніях адмячалася паступленьне і выкананьне сялянства сваіх дзяржаўных абавязацельстваў і здачы ўсіх відаў загатовак.

Старшыня РВК Гарбачоў.

Савецкая эстафэта дапамагла перабудаваць работу саветаў

Коханаўскі раён

У раёне было арганізавана 12 брыгад па 7 чал. у кожнай з раённага партыйнага, камсамольскага і прафэсыянальнага актыву. Брыгады былі накіраваны па ўсіх сельсаветах. На мясцох у брыгады ўлілося яшчэ 121 чал. з мясцовага вясковага актыву.

За час правядзеньня савецкай эстафэты ў раёне арганізавана 7 новых калгасаў, у якія ўступіла 98 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а таксама ўступіла і ў старыя калгасы 54 бядняцка-серадняцкіх гаспадаркі. У 9-ці вёсках раёну арганізаваны ініцыятыўныя групы па ўцягненьні беднякоў і сераднякоў у калгасы.

6 сельсаветаў і 5 брыгад абвясьцілі сябе ўдарнымі ў час правядзеньня савецкай эстафэты на лепшае правядзеньне справаздачна - перавыбарчай кампаніі сельсаветаў. Там, дзе работу праводзілі ўдарныя брыгады, перавыбары сельсаветаў прашлі значна лепш.

Савецкая эстафэта дапамагла выкрыць недахопы ў рабоце сельсаветаў, а таксама дапамагла і перабудаваць работу саветаў тварам да соцыялістычнага сэктару—калгасаў і саўгасаў. Апрача гэтага брыгадзірамі савецкай эстафэты аказана дапамога сельсаветам у складаньні плянаў работы саветаў і праінструктаваны працаўнікі сельсаветаў.

Сакратар РВК Касьцюкевіч.

Дала рэальныя вынікі

Клічаўскі раён

Як толькі быў надрукаваны матар'ял у газэце «Савецкая Беларусь» аб правядзеньні савецкай эстафэты па БССР, раённая выбарчая камісія прыняла пастанову аб уключэньні Клічаўскага раёну ў праводзімую па БССР савецкую эстафэту—«Савецкай Беларусі» і ўвязала яе правядзеньне з перавыбарчай кампаніяй сельсаветаў..

Ня гледзячы на некаторыя выпадкі дрэннай работы брыгад, у раёне **савецкая эстафэта дала рэальныя вынікі. У час савецкай эстафэты арганізавана 7 новых калгасаў. Адначасова выяўлена, што некаторыя сельсаветы зусім ня кіруюць калгасным будаўніцтвам, а некаторыя сельсаветы наадварот, лічылі, што справа калгаснага будаўніцтва—справа Райвыканкому, альбо Райкалгассаюзу.**

Былі выяўлены і станоўчыя бакі работы сельсаветаў. Натолаўскі нацыянальны польскі сельсавет зьяўляецца ўзорам работы па штодзённым кіраўніцтву калгасным будаўніцтвам, у выніку чаго на сёньняшні дзень па сельсавету калектывізавана 64 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Не адстаюць ад яго Максімавіцкі, Уладзіміраўскі і Каўбчонскі сельсаветы.

У час правядзеньня савецкай эстафэты вучні старшых клясаў Клічаўскай сямігодкі арганізавалі брыгады па дапамозе сельсаветам у выкананьні заданьняў палітычна-гаспадарчых кампаній і свае абавязкі брыгадзіры выканалі з посьпехам. Штодзёна брыгадзіры зьбіралі да 2.000 руб. розных відаў падаткаў ад сялян.

У час падрыхтоўкі да перавыбараў сельсаветаў на агульных сходах працоўнага сялянства па вёсках раёну абгаворана адозва ЦВК БССР і асабліва завострывалася ўвага да моманту калектывізацыі.

Старшыня РВК Аноцкі.

І надалей будзем адданымі байцамі калгаснай арміі

Х-му Ўсебеларускаму Зьезду Саветаў—гаспадару БССР—баявое прывітаньне ад Чырвона-штандарнага атраду арміі сацыялістычнага земляробства — калгасьнікаў калгасу імя «Х-ці годзьдзя БССР».

У час падагуленьня вынікаў работы па правядзеньні мінулагодняй вясновай пасеўнай, ўборачнай і асеньняй кампаній, на зьлёце ўдарнікаў **Магілёўшчыны,** калгас «10-ці годзьдзя БССР» атрымаў Чырвоны пераходны сьцяг імя газэты «Камунар Магілёўшчыны» за пасьпяховае правядзеньне пералічаных кампаній.

У сваёй асноўнай масе, калгасьнікі аддана працавалі ўвесь час над тым, каб выканаць усе задачы, пастаўленыя партыяй і Урадам перад калгасам, а таксама апраўдаць назву—чырвонаштандарнага. Калгасьнікі абвясьцілі рашучую і бязьлітасную барацьбу прагульшчыкам, сымулянтам, рвачом і ілжэўдарнікам, якія меліся сярод калгасьнікаў ў калгасе «10-ці годзьдзя БССР».

— Ураджайнасьць палёў калгасу даведзена да 2 тон пшаніцы з аднаго га 1,25 тон аўсу з аднаго га, 1,5 тон ячменю з га, 1,25 тоны жыта з га і да 15 тон бульбы з га.

За гэты час калгасам набыта некалькі жылых дамоў для калгасьнікаў, пабудавана сталярная і кузьня, клюб калгасьнікаў і даабсталяваны кароўнік і сьвінарнік.

Па загатоўках калгасам здадзена: жыта—292 цэнт., пшаніцы— 4 цэнтн., аўсу—96 цэнт., бульбы—90 тон, альбо 210 проц. плянавага заданьня. Па мясазагатоўках ададзена кароў—13 шт., цялят—15 шт. і адна сьвіньня.

Усе гэтыя дасягненьні калгасам атрыманы, дзякуючы Ленінскаму кіраўніцтву партарганізацыі і дапамозе грамадзкіх арганізацый і сельсавету.

Усьвядомліваючы ўсю важнасьць і палітычную значнасьць перажываемага моманту, мы калгасьнікі калгасу імя «10-ці годзьдзя БССР» рапартуем X-му Ўсебеларускаму Зьезду Саетаў тым, што абавязуемся па бальшавіцку выканаць наступнае:

Зараз-жа ссыпаць і ачысьціць насенны фонд.

Да 10-га Сакавіка г. г. скончыць вывазку ўгнаеньня на калгасныя палі.

Да 15-га сакавіка г. г. закончыць рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара і машын.

У паўтара разы павялічыць яравы пасеўны клін калгасу ў другую бальшавіцкую вясну.

Абавязуемся адвесьці пад палявое травасеяньне і каранплоды—184 га, каб стварыць кармавую базу для шпаркага разьвіцьця жывёла-сьвінагадоўчай гаспадаркі калгасу.

У мэтах падвышэньня працоўнай дысцыпліны ў калгасе, калгасьнікі пераходзяць на зьдэльшчыну, стварэньне ўдарных брыгад, заключэньне паміж імі сацдагавораў.

Калгас абавязуецца па бальшавіцку правесьці другую калгасную вясну.

Калгас імя «10-ці годзьдзя БССР», рапартуючы X-му Ўсебеларускаму Зьезду Саветаў аб сваіх дасягненьнях і абавязацельствах на будучы час, **выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва калгас «Новы Мір» (вёска Пясчанка).**

Калгас завярае X-ы Ўсебеларускі Зьезд Саветаў, што і на далей калгасьнікі будуць аддаными байцамі калгаснай арміі за шпаркі рост калектывізацыі БССР, за ліквідацыю кулацтва, як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі, а таксама аддаными байцамі супроць кулакоў і іх агентаў правых і «левых» апартуністаў у партыі, абяцаючы моцна трымаць у сваіх руках Чырвоны пераходны сьцяг і пад кіраўніцтвам Ленінскай камуністычнай партыі выканаць поўнасьцю задачы трэцяга рашаючага году пяцігодкі, задачы другой бальшавіцкай вясны і задачы пяцігодкі ў чатыры гады.

Няхай жыве Ленінскі ЦК КП(б)Б,—арганізатар і кіраўнік магутнага калгаснага прыліву!

Няхай жыве X Усебеларускі Зьезд Саветаў.

Калгасьнікі.

Раённым Выканаўчым Камітэтам і Саветам БССР

Аб сьвяткаваньні міжнароднага жаночага камуністычнага дню—8-га сакавіка

Міжнародны жаночы камуністычны дзень—8 сакавіка, дзень мабілізацыі мільённых мас працоўных жанчын усіх краін на адзіны фронт клясавай барацьбы супроць капіталізму,—у гэтым годзе будзе праходзіць ва ўмовах вялізарнага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, якое праводзіцца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, ва ўмовах, калі разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва зьнішчае рэшткі капіталістычных элемэнтаў, што выклікае шалёную нянавісьць клясавых ворагаў, як унутры СССР, гэтак і з боку імпэрыялістычных дзяржаў, рыхтуючых узброены напад на Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Складаныя задачы, якія стаяць перад партыяй і пралетарыятам па выкананьні пляну сацыялістычнага будаўніцтва 3-га рашаючага году пяцігодкі, па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны, па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных і бязьлітасным змаганьні з контр-рэвалюцыйным нацдэмакратызмам, супроць шавінізмаў усіх колераў і ў першую чаргу супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму як галоўнай небясьпекі на даным этапе, патрабуюць правядзеньня Міжнароднага жаночага камуністычнага дню 8-га сакавіка, як масавай палітычнай кампаніі, пад лёзунгам мабілізацыі актыўнасьці жаночых мас на выкананьне чарговых палітычных і гаспадарчых задач, намечаных апошнімі пленумамі ЦК і ЦКК УсеКП(б) і Пленумам ЦК КП(б)Б.

За апошні год дасягнуты значныя посьпехі ў справе ўцягненьня працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, узрасла колькасьць работніц у складзе рабочае клясы, павялічыўся ўдзел калгасьніц у справе калгаснага будаўніцтва, значна ўзрасла актыўнасьць работніц і сялянак у перавыбарчай кампаніі саветаў і павялічылася іх удзельная вага ў складзе гарадзкіх саветаў, палепшылася культурнае і бытавое становішча работніц і сялянак.

Разам з гэтым работа сярод жанчын яшчэ недастаткова ўкаранёна ў штодзенную дзейнасьць савецкіх, гаспадарчых, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый, недастаткова праводзіцца работа па вылучэньні жанчын на кіруючую работу, слаба пастаўлена работа па кваліфікацыі работніц, бытавое абслугоўваньне работніц усё яшчэ адстае ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Выходзячы з вышэйадзначанага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР прапануе правесьці наступную работу да Міжнароднага жаночага Камуністычнага дню—8 сакавіка 1931 году:

1. Наркаматам, раённым выканаўчым камітэтам і саветам, гаспадарчым, каапэрацыйным і грамадзкім арганізацыям у час падрыхтоўкі да 8-га сакавіка правесьці самаправерку выкананьня дырэктыў Партыі і Ўраду ў галіне ўцягненьня працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, па палепшаньні працы і быту работніц і сялянак, па вылучэньні работніц і сялянак на кіруючую работу, падрыхтоўцы кадраў для паасобных галін сельскай гаспадаркі (жывёлагадоўля, малочная гаспадарка і інш.), арганізуючы вакол гэтай праверкі актыў работніц, батрачак, калгасьніц і працоўных сялянак; арганізаваць шырокае масавае абгаварэньне вынікаў праверкі і далейшых мерапрыемстваў па палепшаньні работы сярод жанчын, адначасова мабілізуючы ўвагу саміх работніц і працоўных сялянак на палепшаньне работы бытавых установ.

2. Гарадзкім саветам сумесна з прафэсыянальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі праверыць становішча кваліфікацыі работніц, намеціць канкрэтныя мерапрыемствы да 8-га сакавіка па масавай кваліфікацыі работніц, перасоўваньні іх на больш кваліфікаваную работу ўнутры прадпрыемства, па вылучэньні лепшых ударніц на гаспадарчую работу, прэміраваньні ўдарніц, утвараючы ўдарныя брыгады работніц па ўдзелу ўсёй масы работніц у сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве, па замацаваньні работніц на прадпрыемствах да канца пяцігодкі, шырока папулярызаваць задачы рабочае клясы па правядзеньні веснавой пасяўной кампаніі і ўдзелу ў гэтым работніц.

Правесьці масавую работу сярод жонак рабочых па ўцягненьні іх у прамысловасьць, у работу па палепшаньні рабочага снабжэньня і каапэрацыі і па разьвіцьці бытавых установ пры ЖАКТ'ах.

3. Народнаму камісарыяту асьветы, Народнаму камісарыяту аховы здароўя, каапэрацыйным і гаспадарчым арганізацыям намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па адчыненьні да 8-га сакавіка бытавых установ, прадугледжаных па бюджэту на 1931 год; гарадзкім саветам своечасова прадставіць памяшканьні для бытавых установ. Бытавым камітэтам і сэкцыям з прыцягненьнем жанчын-членаў саветаў і актыву работніц, калгасьніц—правесьці праверку скарыстаньня бытавых фондаў на палепшаньне і пашырэньне сеткі бытавых установ.

Сьвяткаваньне Міжнароднага жаночага камуністычнага дню—8-га сакавіка на вёсцы павінна быць праведзена пад знакам шырокага ўцягненьня працоўных жанчын у калгасы, шырокага растлумачэньня сутнасьці клясавага змаганьня на вёсцы, ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, пасьпяховага выкананьня кантрактацыі і г. д. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на правядзеньне пасеўнай кампаніі і ўвязку яе з задачамі далейшай калектывізацыі,—роля жанчыны ў гэтай справе надзвычайна вялікая. Сельсаветам, праўленьням калгасаў арганізаваць сумеснае сьвяткаваньне 8 сакавіка калгасьніц і аднаасобніц, прыстасоўваючы да дню сьвята прэміраваньне і вылучэньне лепшых ударніц; арганізаваць з боку калгасьніц сустрэчныя пляны веснавой сяўбы ў тых галінах, дзе пераважнае месца займае жаночая праца (лён, гароднітва, пасеў коранплодаў, жывёлагадоля і г. д.). У час падрыхтоўчай працы да 8-га сакавіка арганізаваць брыгады з актыву калгасьніц па рабоце сярод аднаасобніц з мэтай іх уцягненьня ў калгасы і першапачатковыя сельскагаспадарчыя таварыствы.

У дзень 8-га сакавіка правесьці раённыя нарады жанчын—членаў саветаў і выканкомаў, урачыстыя пленумы гарадзкіх і сельскіх саветаў з дакладамі аб Міжнародным жаночым камуністычным дню—8-га сакавіка, аб выніках работы сярод жанчын у 1930 годзе і мерапрыемствах намечаных у галіне па лепшаньня працы і быту жанчын на 1931 год. На гэтых сходах павінны знайсьці свой поўны адбітак задачы абароны краіны, інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных, асабліва жанчын нацменшасьцяй, пытаньні нацыянальнай палітыкі партыі і ўсе правадзімыя зараз палітычныя і гаспадарчыя кампаніі.

Аб выніках падрыхтоўкі і правядзеньня сьвяткаваньня райвыканкомы і гарсаветы павінны падаць адпаведныя справаздачы Камітэту па палепшаньні працы і быту работніц і сялянак да 20-га сакавіка г. г..

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

15-II—31 г.
г. Менск.

Аб рабоце Гомельскай партарганізацыі

Пастанова ЦК УсеКП(б)

Адзначаючы рад дасягненьняў Гомельскай партарганізацыі ў справе індустрыялізацыі раёну (павялічэньне ў 5 разоў асноўнага капіталу гомельскай дзяржпрамысловасьці) і згуртаваньні сваіх радоў вакол генэральнай лініі партыі, ЦК адначасова канстатуе:

Размах капітальнага будаўніцтва гомельскай прамысловасьці (каля 20 млн. рублёў за апошнія два гады), уцягненьне да 10 тысяч новых рабочых у прамысловасьць і транспарт Гомельскага раёну, рост гаспадарча-палітычнай актыўнасьці шырокіх рабочых мас,—усё гэта, ствараючы спрыяючыя прадпасылкі для пасьпяховай барацьбы за выкананьне і перавыкананьне вытворчых праграм, патрабавала ад гомельскай партарганізацыі рашучага павароту тварам да вытворчасьці і перабудовы пад гэтым пунктам погляду работы ўсіх сваіх зьвеньняў.

Ня гледзячы на гэтыя спрыяючыя ўмовы, гомельская партарганізацыя ня ўмела забясьпечыць выкананьне прамфінпляну на буйнейшых прадпрыемствах раёну (выкананьне вытворчай праграмы Гомсельмашам на 82 проц., фабрыка «Вязуві» на 86 проц., фабрыкай «Праца»—на 25 проц. і інш.). Ня былі таксама асвоены асыгнаваньні на капітальнае будаўніцтва, плян якога выканан у 1929-30 г. толькі на 60 проц.

Ня гледзячы на буйнейшае палітычнае і гаспадарчае значэньне Гомельскага чыгуначнага вузла, партарганізацыя не забясьпечыла адпаведнай ўвагі яго рабоце, у выніку чаго процант хворых паравозаў вырас да 9,2 проц., норма сярэдня-сутачнага прабегу таварных паравозаў недавыканана на 9,6 проц., прастоі вагонаў выраслі да 16,1 проц. (норма 12 проц), прагулы выраслі з 5 да 13 проц.

Такі стан работы прамысловасьці і чыгуначнага транспарту Гомельскага раёну тлумачыцца ў асноўным тым, што гомельская партарганізацыя і асабліва гарком партыі не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі, якія стаялі перад імі.

Гарком ня здолеў мабілізаваць партыйную і камсамольскую арганізацыю на барацьбу за ажыцьцяўленьне задач гаспадарчага будаўніцтва раёну, што ў прыватнасьці знайшло сваё выяўленьне ў надзвычайна нізкім процанце ахопу камуністаў і камсамольцаў сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам (ніжэй процанту ахопу беспартыйных рабочых).

Гарком і партарганізацыя ў цэлым ня здолела арганізаваць актыўнасьць шырокай масы беспартыйных рабочых у справе выкананьня вытворчых праграм, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

З боку гаркому ня было праяўлена дастаткова ўвагі і дакладнасьці ў падборы кіруючых кадраў прадпрыемстваў, у выніку чаго ў кіраўніцтве раду прадпрыемстваў апынуліся апартуністычныя элемэнты.

Адначасова ЦК адзначае вельмі слабае кіраўніцтва прамысловасьцю і чыгуначным вузлом Гомельскага раёну з боку кіруючых рэспубліканскіх органаў (ЦК КП(б)Б, ВСНГБ, праўленьня Заходніх чыгунак).

ЦК прапануе Гомельскаму гаркому і кіруючым рэспубліканскім арганізацыям неадкладна і рашуча выправіць адзначаныя недахопы і забясьпечыць поўнае выкананьне вытворчых праграм прамысловасьці і транспарту ў 1931 г., мабілізуючы на гэта партарганізацыю і шырокія рабочыя масы, дамагаючыся павялічэньня процанту ахопу сацспаборніцтвам і пераводу сацспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень (скразныя брыгады, плянавыя і рацыяналізатарскія групы, аўладаньне тэхнікай вытворчасьці).

Работа чыгуначнага і воднага транспарту павінна стаць у цэнтры ўвагі работы партарганізацыі. Неабходна шырока папулярызаваць рашэньне ЦК ад 10 студзеня і 5 лютага 1931 г. аб рабоце на транспарце, мабілізуючы масы на ліквідацыю прарываў і недахопаў у рабоце Гомельскага вузла і прыстані. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на хутчэйшае правядзеньне рэарганізацыі Гомельскага вузла, выкананьне пляну спэцыяльнага чыгуначнага будаўніцтва, а таксама на падбор сакратара-арганізатара вузла і стварэньне адпаведных умоў для яго работы.

ЦК КП(б)Б узяць пад свой непасрэдны нагляд работу Гомельскага чыгуначнага вузла і праз тры месяцы праверыць работу Гомельскай партарганізацыі пад пунктам погляду выкананьня дырэктыў ЦК па транспарту.

Адзначаючы недастатковы тэмп нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Гомлі, прапанаваць гаркому ў гадавы тэрмін скончыць у асноўным беларусізацыю парт.-сав. прафапаратаў і культурна-бытавых установ (школа, бібліятэка, клюб), пераходзячы ў гэтых органах на беларускую мову і рашуча вылучаючы на кіруючую работу падрастаючыя беларускія кадры. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на вылучэньне беларусаў у прэзыдыум гарсавету, нарасьветы, суд, пракуратуру, ка апэрацыю, кіруючыя партыйныя органы, а таксама на ўзьняцьце ўдзельнай вагі беларусаў у складзе рабочых гомельскай прамысловасьці і транспарту.

Партарганізацыі павесьці больш рашучую барацьбу з праявамі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекай у правядзеньні нацпалітыкі партыі (тэорыя «штучнай» беларусізацыі), узмацніўшы ў той-жа час выкрываньне і барацьбу з праявамі беларускага нацыянал-дэмакратызму, а таксама яўрэйскага і польскага нацыянал-шавінізму, выхоўваючы на гэтай барацьбе партарганізацыю і шырокія рабочыя масы ў духу ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Гаркому забясьпечыць культурна-бытавое абслугоўваньне нацыянальных меншасьцяй (школа, бібліятэка, друк, клюб) і вырошчваньне з іх асяродзьдзя пралетарскіх кадраў шляхам уцягненьня ў ВТНУ, ФЗУ, саўпартшколы, прадпрыемствы.

Рашуча павярнуць работу гарсавету, яго аддзелаў і сэкцый да важнейшых палітычных і гаспадарчых пытаньняў (нац. культурнае будаўніцтва, узьняцьце абароназдольнасьці краіны, выкананьне прам.-і трансфінпляну).

Адзначаючы недастатковае парткіраўніцтва шэфработай прадпрыемстваў над вёскай, ЦК абавязвае Гомельскі гарком карэнным чынам палепшыць пастаноўку шэфработы, асноўным зьместам якой павінна стаць актыўнае садзейнічаньне рабочых прадпрыемстваў у правядзеньні калектывізацыі, арганізацыі працы ў калгасах, вытворчаму каапэраваньню бядняцка-серадняцкіх мас, арганізацыя ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыя няпісьменнасьці.

ПРЫ КАПІТАЛІЗЬМЕ НЯМА ВЫХАДУ З ГОЛАДУ, БЕСПРАЦОЎЯ І НІШЧАТЫ

Пралетарыят і працоўныя ўсяго сьвету ў міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем пакажуць жалезную волю ў барацьбе супроць капітала, супроць фашызма

Рабочыя Нямеччыны рыхтуюцца да міжнароднага пралетарскага агляду—25 лютага

БЕРЛІН. 18-II. **Беспрацоўныя Бэрліну з узрастаючай актыўнасьцю рыхтуюцца да міжнароднага дню барацьбы з беспрацоўем.**

Сёньня беспрацоўныя мэталісты наладзілі сход у памяшканьні біржы працы мэталістаў. Беспрацоўныя нечакана занялі ўсе выхады з тым, каб не дапусьціць паліцыю.

З вялікай палкай прамовай выступіў прадстаўнік беспрацоўнай моладзі. Спробы чыноўнікаў біржы сарваць сход ня ўдаліся. На біржы беспрацоўных служачых у цэнтры Бэрліну крымінальная паліцыя арганізавала літэральна паляваньне за рабочымі і беспрацоўнымі, якія распаўсюджвалі лятучкі да дню барацьбы з беспрацоўем. Камітэт беспрацоўных у адказ на гэтыя прасьледваньні арганізаваў дэманстрацыю.

У Штэтгліцы адбыўся вялікі сход беспрацоўных, на якіх прысутнічала шмат рабочых прадпрыемстваў. Ня гледзячы на забарону, пасьля сходу адбылася дэманстрацыйная працэсія. У паўдзённым квартале Бэрліну адбыўся агульны збор беспрацоўнай моладзі, якая ўваходзіць у рэвалюцыйныя арганізацыі.

Сход рабочага газавага заводу прыняў рэзалюцыю, у якой заяўляе, што рабочыя газавага заводу лічаць сябе зьвязанымі з беспрацоўнымі клясавым братэрствам. Рэзалюцыя настойвае на адмене забароны дэманстрацый і патрабуе, каб паліцыя не зьяўлялася на вуліцах 25-га лютага

**

БЭРЛІН. 20-II. Сёньня ва ўсіх раёнах Бэрліну былі праведзены масавыя мітынгі беспрацоўных. Прыняты рэзалюцыі яшчэ больш узмацніць падрыхтоўку да міжнароднага дню барацьбы супроць беспрацоўя—25 лютага.

Крызіс, беспрацоўе і голад у ПАЗШ расьце

НЬЮ-ЙЕРК. 5-II. Нядаўна агалошаная гадовая справаздача **Канадзкага статыстычнага бюро** падае цэлы рад даных аб эканамічным крызісе ў Канадзе, імпарт у Канадзе за 1930 г. раўнаўся **1.008.000.000 доляраў, г. зн. на 22 проц. менш, чымся ў 1929 г., а экспарт за 1930 г. раўнаўся 886 мільёнаў доляраў, г. зн. на 25 проц. менш чымся ў 1929 г.**

Эканамічны крызіс асабліва моцна адбіўся на сельскай гаспадарцы Канады. Цэны ўраджаю 1930 г. складаюць 631.592.000 доляраў, г. зн. зьнізіліся на 33 проц. у параўнаньні з 1929 г. Рэзка зьнізіліся прыбыткі пармысловых аб'яднаньняў. Па прыватнай ацэнцы, прыбыткі прадпрыемстваў с.-г. машынабудаўніцтва зьнізіліся на 57 проц., а прыбыткі мукамольных млыноў—на 45 проц. Прыбыткі жалезавырабляючай, сталёвай і аўтамабільнай прамысловасьці зьнізіліся на 25 проц.

НЬЮ-ЁРК. 5-II. Абсьледавацелі чырвонага крыжу, якія наведалі фэрмы ва ўсходнім горным раёне штату Кентукі, паведамляюць, што зьбедненыя крызісам збыту, сяляне раёну знаходзяцца ў роспачным становішчы.

Абсьледвацелі прызнаюць, што большасьць сялянскіх дзяцей ходзяць у трантах ці зусім голыя. Шмат якія сем'і як эўрапейцаў, так і нэграў ня маюць ложкаў і сьпяць на падлозе, прыкрываючыся рызьзём. Сялянскае насельніцтва раёну галадае.

ВАШЫНГТОН. 17. Паводле даных міністэрства працы, лік занятых у прамысловасьці рабочых на студзень **зьменшыўся на 4,2 проц.** у параўнаньні са сьнежням 1930 г. Сума выплачанай зарплаты зьменшылася на **8,2 проц.**

Мэр гораду Філадэльфіі **Макей** апублікаваў заяву, у якой падкрэсьлівае **рост нішчаты сярод беспрацоўных.**

Паводле слоў Макея, **у аднэй толькі Філадэльфіі 250 тысяч чалавек ня маюць самага неабходнага для жыцьця**, прычым у ліку гэтых 250 тысяч—**50 тысяч дзяцей.**

Макей заклікае дзелавыя колы да дабрачыннасьці, заяўляючы, што гэта паслужыць на абарону іх дзелавых інтарэсаў **і папярэдзіць паўстаньне і кравапраліцьце. Далей Макей заяўляе, што калі беспрацоўным ня будзе зроблена адпаведная дапамога, дык для папярэджаньня паўстаньняў і бунтаў неабходна будзе ўвесьці ваеннае палажэньне.**

ЛЕНДАН. 18-II. Лік зарэгістраваных беспрацоўных на 9-га лютага складаў 2.637.131. У параўнаньні з мінулым тыднем лік беспрацоўных павялічыўся на 12.895, а ў параўнаньні з мінулым годам—на1.117.157.

Беспрацоўе і голад у Латвіі прымае жудасныя памеры

РЫГА. 10-II. **«Сацыял-Дэмакрат»** падае факты з жыцьця беспрацоўных, якія даюць хоць некаторае ўражаньне аб тым жахлівым становішчы, у якім знаходзяцца беспрацоўныя ў Латвіі.

Газэта паведамляе з Лібавы, што за горадам у нейкай халупе знойдзены замерзлы малады рабочы **Фрыц Ласман**. Калі няшчаснага прывялі ў прытомнасьць, ён расказаў, што доўгі час знаходзіўся без работы і што 6 дзён таму назад гаспадар выкінуў яго на вуліцу, таму, што ён ня мог заплаціць за кватэру. 6 сутак ён прабыў у халупе на марозе і нічога ня еў.

Далей газэта паведамляе з Мітавы, што беспрацоўныя накіравалі дэлегацыю да міністра народнага дабрабыту з патрабаваньнем ужыць захады для палепшаньня іх становішча. Міністр ня прыняў дэлегацыю і даручыў перадаць мітаўскім беспрацоўным, што ўсе іх патрабаваньні адхілены.

**

РЫГА. 14-II. Латвійская тэкстыльная прамысловасьць знаходзіцца ў катастрафічным становішчы. За апошнія месяцы тэкстыльная прадукцыя зьнізілася на 30 проц. На вуліцу выкінута **1.800** тэкстыльшчыкаў.

У той-жа час на некаторых тэкстыльных фабрыках, на якіх вытворчасьць не скарочана, рабочых прымушаюць працаваць 10-12 гадзін у суткі.

Пралетарыят Нямеччыны рыхтуе контр-наступ супроць зьніжэньня заработку

БЭРЛІН. 19-II. **Пашыранае пасяджэньне агульна-нямецкага камітэту рэвалюцыйнай прафапазыцыі выпрацавала плян ударнай трохмесячнай кампаніі рэвалюцыйнай прафапазыцыі супроць драпежніцкага зьніжэньня заработку і супроць фашызму.**

Выточным пунктам гэтай ўдарнай кампаніі, правадзімай ў агульна-нямецкім маштабе зьяўляецца той факт, што да 31 сакавіка прадпрыемцы парашылі скасаваць, з мэтай зьніжэньня заработку калектыўныя дагаворы, што ахапляюць 6 мільёнаў рабочых.

Па ўсёй Нямеччыне павінны быць праведзены масавыя сходы рабочых на прадпрыемствах. На аснове шырокага адзінага фронту будуць абраны камітэты барацьбы, якія павінны падрыхтаваць массы да контр-наступленьня супроць мяркуемага скарочаньня заработку, пачаць забастоўку і пры перавыбарах фабзаўкомаў павінны быць выстаўлены чырвоныя кандыдацкія сьпісы прынамсі, на 3.500 важнейшых прадпрыемствах Нямеччыны

Напярэдадні XIII гадавіны РСЧА

Шэфства рабочых над вайсковымі часьцямі

—сродак узмацненьня абароназдольнасьці СССР

Ажыўленьнем шэфскай работы, перабудаваньнем яе на рэйкі спаборніцтва—адзначым юбілей Чырвонай арміі

Шэфства над Чырвонай арміяй на належную вышыню

Дырэктыва ЦК КП(б)Б даволі яскрава патрабавала правесьці ў лютым месяцы гэтага году агляд рабочага шэфства над Чырвонай арміяй. Аднак у Воршы за агляд яшчэ зусім ня браліся і нават ня ведаюць, што агляд праводзіцца і якія ён мае мэты.

Шэфства над Чырвонай арміяй пакуль што праводзіцца казённа. Толькі раз у год—у гадавіну Чырвонай арміі шэфы бываюць у вайсковых частках і наадварот. Праўда, шэфы яшчэ аказваюць і матар'яльную дапамогу вайсковым часьцям, але гэта не дае тых вынікаў, якія-б былі, калі-б шэфы былі цесна зьвязаны са сваімі падшэфнымі. І вось, у час агляду шэфства над Чырвонай арміяй, патрэбна рашуча дабіцца пералому ў шэфскай справе. Павінна быць установлена цесная сувязь паміж шэфамі і падшэфнымі. Чырвонаармейцы павінны ведаць, як жывуць шэфы-рабочыя, як працуе прадпрыемства, якія маюцца ў яго рабоце дасягненьні і недахопы, чырвонаармейцы павінны свайму шэфу наладзіць вайсковую работу на прадпрыемстве і г. д. У сваю чаргу і шэфы павінны ведаць як ідзе вучоба ў падшэфнай вайсковай частцы, як яна выконвае свой сустрэчны плян, як чырвонаармейцы палітычна падрыхтаваны і г. д. Павінны быць заключаны з абодвух бакоў сацдагаворы і праверацца выкананьне. Гэтага у нас няма, як няма і наогул і асобнага дню, хоць раз у месяц для работы з падшэфнымі вайсковымі часьцямі. Партыйныя арганізацыі некаторых прадпрыемстваў-шэфаў на Аршаншчыне амаль зусім не зьвяртаюць увагі шэфскай рабоце ў Чырвонай арміі. Між тым яе зараз патрэбна з усёй бальшавіцкай рашучасьцю зрушыць з месца. Пара ад урачыстасьцяй і вечароў перайсьці і да больш дзейных спраў, пара наладзіць і замацаваць самую цесную сувязь шэфаў з падшэфнымі.

А. КУДРЫН.

Рыхтуемся да гадавіны

У Аршаншчыне разгарнулася падрыхтоўка да сьвяткаваньня 13-й гадавіны Чырвонай арміі. Сьвята будзе праведзена пад знакам мабілізацыі ўвагі шырокіх працоўных мас да яшчэ большага ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны саветаў, пад знакам шырокага азнаямленьня мас з гераічнай барацьбой Чырвонай арміі. Усе гаспадарча-палітычныя кампаніі, якія зараз праводзяцца ў раёне, цесна ўвязаны з пытаньнямі ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

У цэхах прадпрыемстваў, на сходах рабочых, у саўгасах, калгасах і вёсках ужо праводзяцца гутаркі аб Чырвонай арміі.

Райсавет, Асаавіяхэм і Райкалгасса юз зараз праводзяць праверку становішча вайсковай работы ў калгасах, становішча вайсковых куткоў там-жа. Разам з гэтым арганізуецца шэфства часьцей Чырвонай арміі над калгасамі.

22-га лютага адбудзецца пашыраны ўрачысты пленум Гарсавету з удзелам партыйных, профсаюзных і камсамольскіх арганізацыях, а таксама і грамадзкіх, прысьвечаны сьвяткаваньню 13-й гадавіны Чырвонай арміі.

20, 21 і 22 лютага па ўсіх прадпрыемствах і ў частцы калгасаў будуць праведзены лятучыя мітынгі. 20-га будзе таксама праведзена канфэрэнцыя камскладу запасу.

23-га лютага будуць арганізаваны стралковыя і спартыўныя спаборніцтвы Чырвонай арміі, прафсаюзаў і камсамолу. У гэты-ж дзень будзе праведзен збор сродкаў на дырыжабль «Клім Варашылаў».

Раённая газэта і насьценгазэты ўсіх прадпрыемстваў, установ, саўгасаў і калгасаў таксама прымаюць актыўны ўдзел у правядзеньні сьвяткаваньня 13-й гадавіны Чырвонай арміі.

Мілашэўскі.

Наладжваем выезды ў падшэфныя калгасы

Гомель. Падрыхтоўка да 13-й гадавіны РСЧА на ўсіх прадпрыемствах разгортваецца шпаркімі тэмпамі.

Усе прадпрыемствы 21, 22 і 23 лютага праводзяць урачыстыя вечары рабочых разам з чырвонаармейцамі падшэфных вайсковых часьцей. На ф-цы «Камінтэрн» і ў Палесдруку на вечарох лепшым байцом-ударнікам будуць выданы прэміі ад рабочых калектываў прадпрыемстваў.

На заводзе імя Ланцуцкага, «Пралетары» ды інш. разгортваецца масавае ўцягненьне рабочых у рады Асавіяхіму, праводзіцца агляд стану шэфскай работы. Завод «Пралетары» праводзіць сьвяткаваньне юбілею пад знакам барацьбы за выкананьне колькасных і асабліва якасных паказальнікаў прамфінпляну першага квартала трэцяга рашаючага году. «Пралетары» накіроўвае на сьвята сваіх прадстаўнікоў у Н-скі падшэфны паграматрад.

У дні юбілею ўсе прадпрыемствы разам з падшэфнымі вайсковымі часьцямі наладжваюць выезды ў падшэфныя калгасы для правядзеньня сьвята, у дапамогу падрыхтоўцы да другой веснавой сяўбы.

М. Р.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ СРОДКІ ЎСТАНОЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ.

У адпаведнасьці з пастановаю ЦВК і СНК СССР за 13 сьнежня 1930 г. і для скасаваньня пастановы ЦВК і СНК БССР за 4 жніўня 1927 г. «Пра спэцыяльныя сродкі ўстаноў, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце» (З. З. БССР 1927 г., № 33, арт. 169). Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Спэцыяльнымі сродкамі зьяўляюцца сумы, якія складаюцца з даходаў устаноў, што знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце, і якія на падставе асобных пастаноў заканадаўчых органаў могуць выдаткоўвацца ўстановамі на спэцыяльныя мэты без правядзеньня па даходнай і выдатковай частцы дзяржаўнага бюджэту БССР.

2. Установам, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце БССР, права мець спэцыяльныя сродкі даецца пастановамі Савету Народных Камісараў БССР.

3. На кожны від спэцыяльных сродкаў установамі, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце БССР, складаюцца штогод каштарысы па даходах і па выдатках.

Гэтыя каштарысы падаюцца ў Народны Камісарыят Фінансаў БССР з аб'яснілянымі запіскамі разам з каштарысамі адпаведных ведамстваў па дзяржаўным бюджэце.

Каштарысы па спэцыяльных сродках разглядаюцца і зацьвярджаюцца Народным Камісарыятам Фінансаў БССР па ўзгадненьні з адпаведным ведамствам.

Разнагалосьсі паміж Народным Камісарыятам Фінансаў БССР і ведамствам канчаткова вырашаюцца Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР.

Каштарысы спэцыяльных сродкаў установ, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце БССР, яднаюцца Народным Камісарыятам Фінансаў БССР у агульны звод, які зьяўляецца абавязковым дадаткам да зводу рэспубліканскага бюджэту.

Каштарысы спэцыяльных сродкаў па ўстановах Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР зацьвярджаюцца Народным Камісарыятам Фінансаў БССР па ўзгадненьні з Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР.

4. Формы каштарысаў па спэцыяльных сродках, а таксама клясіфікацыя па кожнаму асобнаму віду гэтых сродкаў распрацоўваецца адпаведнымі ўстановамі, якія знаходзяцца на рэспубліканскім бюджэце, па ўзгадненьні з Народным Камісарыятам Фінансаў БССР дапасавальна да клясіфікацыі па дзяржаўным бюджэце.

5. Калі не пададзены ў Народны Камісарыят Фінансаў БССР ва ўстаноўлены тэрмін каштарыс спэцыяльных сродкаў ці не будзе зацьверджаны Народным Камісарыятам Фінансаў БССР да пачатку бюджэтнага году, дык выдаткі да зацьверджаньня каштарысу могуць рабіцца ў межах сум, вылічаных ведамствам у пададзеным ім у Народны Камісарыят Фінансаў БССР праекце каштарысу, але ня больш аднэй дванаццатай гадовага вызначэньня штомесяц.

Выдаткаваньне спэцыяльных сродкаў да падачы каштарысу ў Народны Камісарыят Фінансаў БССР забараняецца.

6. Калі права мець спэцыяльныя сродкі будзе дадзена ўстанове на працягу бюджэтнага году, дык адпаведнае ведамства павінна не пазьней як праз месяц ад дня выданьня прадугледжанай у арт. 2 пастановы Савету Народных Камісараў БССР падаць на зацьверджаньне Народнага Камісарыята Фінансаў БССР даходныя і выдатковыя каштарысы па спэцыяльных сродках на тую частку бюджэтнага году, якая асталася.

7. Спэцыяльныя сродкі ведамстваў захоўваюцца на процантных бягучых рахунках ва ўстановах, на якія ўскладзена касавае выкананьне каштарысаў адпаведных ведамстваў.

Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР па ўзгадненьні з зацікаўленымі ведамствамі даецца права дазваляць захаваньне спэцыяльных сродкаў устаноў, якія знаходзяцца на рэспубл.канскім бюджэце, у дзяржаўных працоўных ашчадных касах.

8. Спэцыяльныя сродкі павінны выдаткоўвацца ў строгай адпаведнасьці з прызначэньнем гэтых сродкаў у межах зацьверджаных каштарысаў і гатоўкі.

Не дазваляецца перасоўваць каштарысныя прызначэньні з аднаго віду спэцыяльных сродкаў у каштарыс другога віду.

Пры недапаступленьні даходаў па каштарысу спэцыяльных сродкаў установа павінна скараціць у адпаведным разьмеры выдаткі па даным каштарысе.

Калі пры выкананьні зацьверджанага даходнага каштарысу выявіцца перавышэньне даходаў над выдаткамі больш 20 проц. даходных вылічэньняў і ўстанова мяркуе павярнуць гэтае перавышэньне на выдаткі ў гэтым жа годзе, дык складаюцца дадатковыя даходныя і выдатковыя каштарысы, якія разглядаюцца і зацьвярджаюцца ў такім самым парадку, як і асноўны каштарыс.

9. Астача спэцыяльных сродкаў, якая можа выявіцца да канца бюджэтнага году, пераносіцца ў даходную частку каштарысу па спэцыяльных сродках наступнага году, калі іншае скарыстаньне астачы не прадугледжана пастановамі аб даных спэцыяльных сродках.

10. Справаздача, рэвізія і кантроль спэцыялных сродкаў робяцца ў агульным парадку, ўстаноўленым для сродкаў, якія праводзяцца па дзяржаўным бюджэце.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР:
А. Чарвякоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР:
К. Бэнэк.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР:
А. Хацкевіч.

15 лютага 1931 г.
г. Менск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады БССР

ПРА СКЛАДАНЬНЕ ФІНАНСАВАГА ПЛЯНУ НА 1931 ГОД.

Эканамічная Нарада БССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць усе ўстановы і ведамствы пад асабістую адказнасьць іх кіраўнікоў падаць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР не пазьней 15 лютага 1931 г. справаздачу аб выкананьні фінансавых плянаў за асобны квартал 1930 г.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і Беларускай Канторы Дзяржбанку спыніць ўсякае фінансаваньне і крэдытаваньне тых арганізацый і ведамстваў, якія не пададуць пляны, якія вызначаны ў арт. 1 гэтай пастановы.

Нам. Старшыні СНК і Эканамічнай Нарады БССР
К. Бэнэк.

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР
Л. Дубавіцкі.

8 лютага 1931 г.
г. Менск.

ПОЎНАЙ ЛІКВІДАЦЫЯЙ ПРАРЫВАЎ

У ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ

адзначыць X Усебеларускі Зьезд Саветаў

Спажывецкая каапэрацыя і ЦРК па мабілізацыі сродкаў ганебна адстаюць

Работа спажывецкай каапэрацыі і ЦРК БССР па мабілізацыі сродкаў за першую дэкаду лютага не дала належнага пералому.

Месячнае заданьне па мабілізацыі сродкаў Райспажыўтаварыствы і ЦРК на 10 лютага выканалі ўсяго на 12,7 проц. Па Райспажыўтаварыствах фінансавы плян выканаваны толькі на 14,8 проц., прычым па паёх плян выканан на 16,5 проц., па ўкладах на 9,2 проц. і па мэтавых узносах на будаўніцтва на 35,8 проц.

Яшчэ большае адставаньне наглядаецца за ЦРК, якія выканалі лютаўскае заданьне за першую дэкаду толькі на 6,5 проц.

Па паёх ЦРК заданьне выканалі на 0,3 проц.

Работнікі каапэрацыі і вясковых крам у сваёй рабоце спадзяюцца на самацёк, не вядуць ніякай растлумачальнай работы сярод каапэраванага насельніцтва і не мабілізуюць на гэту справу вясковага актыву і шырокіх рабочых калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас. Праваапартуністычная недаацэнка значэньня работы па мабілізацыі сродкаў павінна быць з ўсёй рашучасьцю ліквідавана.

Партыйна-камсамольскія і прафэсыянальныя арганізацыі павінны наладзіць сыстэматычнае кіраўніцтва работай каапэрацыі і скласьці грамадзкую думку вакол прарываў фінпляну ў спажывецкай каапэрацыі і ЦРК.

Лёнаканапляводчая каапэрацыя мабілізацыю сродкаў і вытворчае каапэраваньне—правальвае

Вытворчае каапэраваньне і мабілізацыя сродкаў па лёнаканапляводчай каапэрацыі за студзень месяц як і ў асобным квартале правалены. З 34 раёнаў па вытворчым каапэраваньні за студзень месяц 13 ніжэйпаказаных раёнаў ніякай работы не вялі, а менавіта: Боркавічы, Бешанковічы, Багушэўск, Ветрына, Высачаны, Гарадок, Дрыса, Карма, Крупкі, Любань, Хоцімок, Чавусы і Краснаполе. З прычыны дрэннай работы па вытворчым каапэраваньні студзеньскі плян у гэтых раёнах выканаваны ўсяго на 9,5 проц.

Для апраўданьня гэтага правалу няма ніякіх падстаў. Той факт, што такі адсталы ў гэтай рабоце раён, як Чарэйскі, у апошні год зрабіў значны крок наперад і свой студзеньскі плян выканаў на 136 проц., арганізаваўшы 21 вытворчае таварыства, і каапэраваўшы ў іх 1964 бядняцка-серадняцкіх двара, супярэчыць усякім спасыланьням на «аб'ектыўныя» прычыны. Некаторая работа праведзена і ў Мсьціслаўскім раёне, дзе каапэравана 727 двароў, і гэта ў тым раёне дзе яшчэ месяц таму назад кіраўнік Райкаапсаюзу адкрыта заяўляў, «што няма ніякіх магчымасьцяй ў Мсьціслаўскім раёне займацца вытворчым каапэраваньнем і што гэта зусім лішняя справа».

У пастанове студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, адзначана што зрыў вытворчага каапэраваньня тлумачыцца выключна праваапартуністычнай недаацэнкай важнасьці гэтай работы. Таму рашуча ставячы пытаньне аб калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі нельга абмінуць пытаньне аб вытворчым каапэраваньні тых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія яшчэ не ўвайшлі ў калгасы. Вытворчыя таварыствы ёсьць і будуць адным з асноўных мэтадаў падрыхтоўкі паасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да пераходу на калектыўныя формы землякарыстаньня, таму зараз у перыяд падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы вытворчаму каапэраваньню павінна аддавацца асаблівая ўвага.

З прычыны дрэннага выкананьня пляну вытворчага каапэраваньня плян мабілізацыі паявых і ўступных капіталаў за студзень месяц выканан усяго на 2,8 проц. З 34-х раёнаў лёнаканапляводчай каапэрацыі ўдзельнічалі ў рабоце па мабілізацыі паявых і ўступных капіталаў толькі 11 раёнаў, а 23 раёны ніякага ўдзелу ў рабоце па збору гэтых сродкаў ня прымалі. З удзельнічаўшых у рабоце па збору паявых капіталаў толькі Вушацкі раён свой плян выканаў на 31 проц., а астатнія 10 раёнаў выканалі пляны ніжэй 13 проц.

Трэба каб раённыя кіраючыя арганізацыі больш рашуча заняліся гэтым пытаньнем і пэрыядычна заслухоўвалі справаздачы райкаапсаюзаў аб вытворчым каапэраваньні і мабілізацыі сродкаў і аказвалі райкаапсаюзам адпаведную дапамогу.

Л.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ПЭДГАБІНЭТ

21-II у 19 гадзін нарада Загадчыкаў гарадзкіх школ сумесна з важатымі фарпастоў і вучкомамі па пытаньням: 1. Пасеўкампанія, 2. Гарадзкая політэхнічная канфэрэнцыя вучняў, 3. Дзень Чырвонай арміі.

Яўка абавязкова.

ЗАЎТРА

22-II у 19 гадзін сход настаўнікаў нямецкае мовы па пытаньням пляну працы на другое паўгодзьдзе.

З ПАНЯДЗЕЛКА 16-га ЛЮТАГА

Беларускі Другі Дзярж. тэатр — 21-га лютага паказ для Усебеларускага зьезду саветаў „РЭЙКІ ГУДУЦЬ“ п'еса ў 5-ці дзеях 9 абразох. Пачатак а 8 гадз.

„Чырвоная Зорка“ — Вялікі гукавы фільм 13 ДЗЁН (справа „прампартыі“). Папярэдні продаж білетаў у тэатр. рабочай касе. Пачатак а 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса а 5 гадзіне.

Кіно „Інтэрнацыянал“ — Новы савецкі фільм вытворчасьці „Пр укіно“ ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ. Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса ад 4 гадз. 30 хв.

Кіно „Пралетары“ — Апошнія 3 дні 16, 17 і 18 лютага мастацкі фільм МАБУЛ (Крававы патоп) Драма ў 9 частках. Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса ад 4 гадз.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.